Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Цана нумару—3 кап.

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц . . . 10 к. » 3 » . . . 2 р. » 6 » . . . 4 » » 1 год . . . 7 » Зьмена адрасу: іншагародняя—20 к., мясцовая—10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок нонпарэлі пасьля тэксту . . . 50 к. За радок нонпарэлі насярод тэксту . . . 1 р. За радок нонпарэлі перад тэкстам . . . 1 р. 50 к. Сьпешныя—на 50 проц. даражэй. Звыш тарыфу бярэцца 10 проц. падатку.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумэнт . . 35 кап., кожны дадатковы—15 ,, Беспрац. і чырвонаармейскія дакумэнт—15 к., за кожны дадатковы—5 кап. Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

Падпіска прымаецца ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх паштова-тэлеграфных канторах. Абвесткі прымаюцца канторай газэты Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў). АДРАС РЭДАКЦЫІ—Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў). Тэл. рэдакцыі № 478.—Тэл. рэдактара № 749.—Тэл. Канторы № 244.

...ы год выданьня. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 24 (1916) Нядзеля, 30-га студзеня 1927 г.

Зьніжэньне цэн і барацьба з бюракратызмам.

Асноўным звяном параўнаўчага павольнага пасоўваньня наперад справы барацьбы за зьніжэньне цэн на прамысловыя тавары трэба бясспрэчна лічыць бюракратычнасьць гандлёва-гаспадарчага апарату, яго імкненьне да захаваньня сваіх сучасных формаў. У гандлёвых выдатках да гэтага часу каля [..]0 проц. прыпадае на ўтрыманьне служачых. Колькасьць пасрэдніцкіх звеньняў у тавараправодзячай сыстэме вельмі часта даходзіць да 4-х, а [..]зей 3-х як быццам не спыняецца [..] ў адным апараце. Пры гэткіх умовах зусім вачавідна, што дырэктыве Савету Працы і Абароны аб дзесяціпроцантным зьніжэньні цэн прыходзіцца перамагаць велізарныя перашкоды, выключную інэрцыю бюракратычнага кіраўніцтва, які сваім цяжарам адцягвае справу назад.

Калі прыглядзецца да сярэдняй лічбы агульнага зьніжэньня цэн, дасягнутага па ўсяму Саюзу, дык відаць, што яна складае ледзь 3 процанты. А, між тым, апошнія два месяцы паказваюць, што перад намі пэўнае затрыманьне ў ходзе барацьбы за зьніжэньне цэн. Мала таго, дзе-ні-дзе наглядаецца адыход назад.

Абвастрэньне неадпаведнасьці паміж цэнамі на сельска - гаспадарчыя прадукты, якія стабілізаваліся на больш-менш пажаданым узроўні, і цэнамі на прамысловыя тавары, ёсьць сур'ёзны факт у нашым гаспадарчым жыцьці за апошні час. Ён патрабуе згуртаваньня ўсяе ўвагі працоўных на праблеме зьніжэньня цэн.

У распараджэньні нашае прамысловасьці маецца даволі рэсурсаў, каб дамагчыся вызначанага нашай партыяй і савецкай уладай проценту зьніжэньня.

Гутарка ідзе аб галоўнай у нашай бягучай палітыцы—аб неабходнасьці ўмацаваньня гаспадарчай змычкі паміж рабочай клясай і сялянствам, адной з умоў якой уласна і зьяўляецца абвешчаная партыяй барацьба за зьніжэньне цэн, барацьба з бюракратызмам.

Гэтыя дзьве задачы тут, на гэтым гаспадарчым фронце цалком злучаюцца. Мы бачым, што біць па высокіх цэнах,—значыць біць па бюракратызму. Як вядома, апазіцыя ў нашай партыі ў сваіх рэцэптах «ратунку» гаспадаркі, з прычыны рэзкага пагоршаньня якой апазыцыя біла фальшывую трывогу, прапанавала павышэньне цэн. Пункт гледжаньня ЦК і ўсёй партыі апазіцыя дала назву: «спажывецкі», таму што тут, быццам, галоўным чынам, стаўка на ўвагу да спажыўца. У гэтай тэорыі, як і ва ўсім іншым, што высоўвала апазіцыя па гаспадарчай лініі адбілася, як у кроплі вады,—уся схэматычнасьць, нежыцьцёвасьць, бюракратычнасьць не поглядаў і мэтадаў.

І сапраўды, што выяўляе сабой ідэя апазіцыі наконт павышэньня цэн, як не тыповае бюракратычнае скажэньне. Спыніцца на гэтай пазіцыі—значыць не толькі прыдаць усяму гандлёва-гаспадарчаму апарату поўную нерухомасьць, але і даць штуршок далейшаму разьвіцьцю руціны і плевацельскага падыходу да масавага спажыўца,—да рабочага, селяніна, служачага.

На вопыце самога жыцьця доказан абсалютны крах усіх практычных прапановаў апазіцыі. Апазіцыя пераацэньвае ход дыфэрэнцыяцыі на вёсцы і ролю кулака. Апазіцыя аказалася пабітай жыцьцём у сваіх прадказаньнях аб завастрэньні таварнага голаду. Практыка жыцьця ўсёй сваёй суровай логікай супраціўляецца ідэі высокіх цэн, якая ёсьць не што іншае, як ажыцьцяўленьне чыстага бюракратызму, як стаўка на індыфэрэнтныя адносіны да рабочага і селяніна, на бяздушны падыход да лёсу сацыялістычнае гаспадаркі.

Біць па высокіх цэнах, біць па бюракратызму, перамагчы усімі сродкамі бяздумнасьць мала дапасаванага да патрэб шырокага спажыўца гаспадарчага гандлёвага апарату—гэта буйнейшая баявая задача сучаснага пэрыяду, якая ва ўвесь рост паўстае перад мільённымі рабочымі масамі саюзу, перад партыяй і прафсаюзамі, перад усімі арганізацыямі рабочае класы і сялянства.

Перад „урачыстым“ адчыненьнем вэнгерскага парляманту.

ПРАЛЕТАРЫЯТ РЫХТУЕЦЦА ДА МАСАВЫХ ДЭМАНСТРАЦЫЙ ПРАТЭСТУ—АБЛАВЫ І АРЫШТЫ РАБОЧЫХ.

ВЕНА, 28-І. Адозва сацыялістычнае рабочае партыі Вэнгрыі да ўсіх працоўных з заклікам наладжваць дэманстрацыі пратэсту з прычыны адчыненьня новага парляманту, выклікала ва ўрадавых колах непакой.

Не зважаючы на паліцэйскія захады, распаўсюджаньне лятучак і адозваў у рабочых кварталах Будапэшту не спыняецца. Паліцыя арганізавала аблавы ў сталіцы і правінцыі, прычым учыніла шматлікія арышты.

Паліцыя, як звычайна, зацьвярджае, нібыта дырэктывы арганізаваць дэманстрацыю «былі прысланы з Масквы праз Вену». Ад арыштаваных дамагаюцца паказаньняў у гэтым сэнсе праз катаваньне і гвалт.

Арыштаваныя ўдзельнікі сходу памяці Леніна высланы з Будапэшту.

На шмат якіх заводах рабочыя ганьбяць дзеяньні сацыял-дэмакратычных лідэраў, якія адхілілі прапанову палітычнае рабочае партыі аб супольнай дэманстрацыі.

Адчыненьне абедзьвюх палат адбудзецца 29-га студзеня.

Паліцыя забараніла на вуліцах розныя групаваньні і перагарадзіла з усіх бакоў доступ да памяшканьня парляманту.

СССР адмаўляецца ад працы ў камісіях Лігі Нацый.

МАСКВА. 16-га сьнежня мінулага году Ліга Нацый зьвярнулася да ўраду СССР з запросінамі ўзяць удзел у спэцыяльнай камісіі па рэдагаваньні згоды аб вырабе прыватнымі асобамі зброі і ваенных матар'ялаў.

Народны Камісарыят па Замежных Справах адказаў 27-га студзеня адмовай, бо гэтая камісія склікаецца ў Швэйцарыі (Жэнева).

Новы румынскі сатрап у Бэсарабіі „распачаў працу“.

ВЕНА, 28. Генэрал Раскану, назначаны камісарам па справах Бэсарабіі і Букавіны, урачыста распачаў выконваць свае абавязкі 24-га студзеня ў дзень гадавіны анэксіі Бэсарабіі Румыніяй. У сваёй прамове ў Кішынёве Раскану абяцаў Бэсарабіі „законамерны і чалавечны рэжым“. Апроч таго, Раскану абвясьціў адозву да „бэсарабскага жыхарства без розьніцы веры, нацыянальнасьцяў, прафэсій і класаў“ з заклікам падтрымаць яго дзейнасьць на пасадзе камісара па справах Бэсарабіі і Букавіны.

Яшчэ выключэньне з с.-д. партыі за падарожжа ў СССР.

БЭРЛІН, 25. Прэзыдыум сацыял-дэмакратычнае партыі выключыў з партыі ўдзельніка рабочае дэлегацыі ў СССР Бэсера, які быў членам акруговага фабзаўкому дырэкцыі дзяржаўных чыгунак у Брэслаўлі. Матывіроўка ў пастанове аб выключэньні гаворыць, што Бэсер абвінавачвае нямецкую сацыял-дэмакратычную прэсу ў выдумваньні страхаў аб Савецкім Саюзе і заклікаў да барацьбы за сацыялізм у Нямеччыне без дапамогі сацыял-дэмакратычных лідэраў.

Савецкія лыжнікі недалёка ад Осло

ОСЛО, 28-1. 28-га студзеня савецкія лыжнікі прышлі ў Кенгсвінгер (за 88 кілёмэтраў на паўночны ўсход ад Осло). Прабегу перашкаджае адліга, але лыжнікі ўсё ж такі знаходзяцца ў вельмі добрым настроі.

ОСЛО, 29-1. У Кенсвінгеры да савецкіх лыжнікаў далучылася трое лыжнікаў рабочае спартыўнае арганізацыі ў Осло. Усе сямёра вышлі з Кенгсвінгеру 28-га студзеня, а 7 гадз. 30 хвіл. вечара. У Осло лыжнікаў чакаюць 30-га студзеня раніцаю.

Пасылка ў Шанхай 16.000 ангельскага войска.

ВЫКАНКОМ КАМІНТЭРНУ ЗАКЛІКАЕ РАБОЧЫХ УСІХ КРАЁЎ НЕАДКЛАДНА ПЕРАШКОДЗІЦЬ ІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНАЙ АВАНТУРЫ У КІТАІ.

Пачатак ангельскае інтэрвэнцыі ў Кітаі.

16.000-ны ангельскі гарнізон у Шанхаі. Падрыхтоўка эвакуацыі чужаземцаў з Кантону.

ХАРБІН, 28-І. Паведамленьне аб пасылцы ў Шанхай 16-ці тысяч ангельскага войска разглядаецца ў кітайскіх колах, як пачатак узброенае інтэрвэнцыі.

На ангельскія заявы, нібы-та войска пасылаецца на абарону ангельцаў, якія жывуць у Шанхаі, кітайскія колы (нават і не гамінданаўскія) глядзяць іранічна.

Гэтыя колы лічаць, што 16-ці тысяч войска для абароны 7-мі тысяч ангельскіх грамадзян у Шанхаі—за-шмат.

Агенцтва Рэйтэра паведамляе, што ў Гонконге лічыцца магчымаю эвакуацыя чужаземцаў з раёну дэльты рэчкі Жамчужнае (на якой знаходзіцца Кантон), а таксама з некаторых гарадоў правінцыі Гуандунь. Італьянскія місіянэры ўжо выяжджаюць.

Водлуг думкі кітайскіх колаў, гэтая нічым не выкліканая эвакуацыя дазваляе думаць, што інтэрвэнцыя рыхтуецца да моманту прыезду ангельскага войска.

АНГЕЛЬСКАЯ ШЛЯХЕТНАСЬЦЬ.

ЛЁНДАН, 28-1. Учора ўвечары ангельскі міністр калёній Эмеры выступіў у Лёндане з прамоваю адносна становішча ў Кітаі. Эмеры прызнаўся, што ў сувязку з ростам кітайскага нацыянальнага руху, шмат якія з прывілеяў, якія карыстаюцца ў Кітаі чужаземцы, зьяўляюцца ў сучасны момант ненармальнымі і зьняважлівымі для нацыянальнага пачуцьця кітайскага народу.

«З гэтае прычыны,—сказаў Эмеры,—ангельскі ўрад першы падаў прапанову ўвесьці больш лібэральную палітыку, якая ідзе насустрач жаданьням кітайскага народу. Не зважаючы на лёгкі правакацыйныя інцыдэнты ў Ханькоу, ангельскі ўрад не адмовіўся ад гэтае палітыкі і вядзе перамовы з лідэрамі, як паўднёвага, так і паўночнага Кітаю, прапануючы ім такія шляхэтныя і адказваючыя жаданьням кітайскага народу зьмены сучаснай сыстэмы ўгавораў, што нельга сабе ўявіць, каб гэтыя зьмены былі адхілены якой-небудзь палітычнай групоўкай у Кітаі, калі яна грунтуецца выключна на інтарэсах дабрабыту Кітаю і нават на вымаганьнях кітайскага нацыянальнага руху. Калі нашыя прапановы будуць адхілены, дык гэта можа здарыцца толькі таму, што тыя, хто будзе пярэчыць ім, маюць на ўвазе не толькі існуючае ў Кітаі становішча, але знаходзяцца пад уплывам з боку».

ЗГАВОР ВАНДЭРВЭЛЬДЭ З ЧЭМБЭРЛЕНАМ.

ЛЁНДАН, 28-1. Сёньня адбылося спатканьне бэльгійскага міністра замежных спраў Вандэрвэльдэ з Чэмбэрленам.

РЭГІСТРАЦЫЯ АМЭРЫКАНЦАЎ У ШАНХАІ.

ПЕКІН. Амэрыканскае консульства абвясьціла рэгістрацыю ўсіх амэрыканцаў, якія жывуць у Шанхаі.

ДАЛЕЙШАЯ ПАСЫЛКА ВОЙСК У ШАНХАЙ.

ЛЁНДАН, 28. Сёньня ў Саутгемптоне пагружаны два батальёны войск для пасылкі ў Кітай.

Умовы кантонскага ўраду для адхіленьня канфлікту ў Шанхаі

НЬЮ-ЁРК, 2. Згодна паведамленьняў з Шанхаю, нацыянальны кітайскі ўрад, каб адхіліць канфлікт з-за Шанхаю, зьвярнуўся да амэрыканскага, ангельскага і японскага консулаў з наступнымі прапановамі: Англія ўтрымліваецца ад высадкі войск у Шанхаі, войска Сун-Чуан-Фана павінны выйсьці з гораду, нацыянальны ўрад абавязваецца не падвозіць войск да Шанхаю бліжэй, чымся да Сун-Цзяна на поўдзень ад гораду і Сучжоу на поўнач ад яго; прадстаўнікі нацыянальнага ўраду бяруць удзел у кіраваньні міжнародным кварталам і канцэсіямі.

У АБАРОНУ КІТАЙСКАЕ РЭВАЛЮЦЫІ.

СУПРОЦЬ ПАСЯГНЕНЬНЯ ІМПЭРЫЯЛІСТАЎ НА ВОЛЮ КІТАЯ.

Адозва выканкому Камінтэрну.

МАСКВА, 28. Выканком Камінтэрну зьвярнуўся да рабочых усіх краёў з такою адозваю: „Міжнародная буржуазея сьцягвае марскія і сухазямныя сілы да Шанхаю, каб абярнуць яго ў апэрацыйную базу для адкрытае ваеннае інтэрвэнцыі ў Кітаі. На чале міжнародных драпежнікаў ідзе ангельскі ўрад.

Не заспакойвайце сабе думкай, што адсутнасьць супрацоўніцтва між імпэрыялістычнымі драпежнікамі робіць немагчымым іх сумесны напад на кітайскую рэвалюцыю. Міжнародныя душагубы дагаворацца аб падзеле здабычы.

Армія паклёпнікаў распаўсюджвае праз буржуазны друк фальшывыя выдумкі аб «анархічным хаосе» у рэвалюцыйным Кітаі. Не давярайце паклёпнікам, не паддавайцеся вераломству здрадніцкіх правадыроў. Перамога ваеннае інтэрвэнцыі ў Кітаі значыла-б перамогу фашызму ў міжнародным абхваце і няўхільнасьць новага наступу капіталу супроць пралетарыяту ва ўсіх краёх.

Напад на Кітай зьяўляецца падрыхтоўкаю і рэпэтыцыяю вайны супроць СССР, гэтай крэпасьці пралетарскае рэвалюцыі. Не марнуйце часу. Арганізуйце абарону і падтрыманьне кітайскае рэвалюцыі. Устанавіце адзіны фронт барацьбы ўсіх рабочых арганізацый супроць вялікае небясьпекі. Арганізуйце, умацняйце, пераводзьце на баявое становішча ўсе арганізацыі, якія вядуць барацьбу пад лёзунгам: «Рукі прэч ад Кітаю».

УРАД БУРЖУАЗНАГА БЛЁКУ У НЯМЕЧЧЫНЕ.

СКЛАД ГАБІНЭТУ.

БЭРЛІН, 28-І. У склад новага ўраду, згодна сьпісу, які 28-га студзеня паведамляўся ў парляманцкіх колах, увайшлі такія 11 асоб: рэйхсканцлер і міністр акупаваных абласьцёў—Маркс (цэнтр), міністр замежных спраў—Штрэземан (народная партыя), фінансаў—Гелер (цэнтр), народнае гаспадаркі—Курціус (народная партыя), працы—Браунс (цэнтр), юстыцыі—Грэф (цюрынгенскі дэпутат, нацыяналіст), абароны—Геслер (дэмакрат, які ўваходзіць ва ўрад не як сябра партыі, а асабова), пошт і тэлеграфаў—Штынгль (баварская народная партыя), шляхаў—Кох (нацыяналіст), земляробства—Шыле (нацыяналіст). У якасьці-ж міністра ўнутраных спраў і намесьнікам канцлера ўвайшоў у склад ураду лідэр парляманцкае фракцыі нацыяналістаў Вэстарп.

Сьпіс гэты ў парляманцкіх колах лічыцца канчатковым.

ЗГОДА Ў УРАДАВАЙ КААЛІЦЫІ ПА ПРАГРАМНЫХ ПЫТАНЬНЯХ.

БЭРЛІН, 28. За ўчарайшы дзень перамовы аб стварэньні ўраду прывялі да канчатковае згоды па ўсіх пытаньнях праграмнага характару. Пытаньне аб разьмеркаваньні партфэляў не ўпарадкавана.

Учора рэйхстаг спыніў заняткі да 3-га лютага, калі ім будзе заслухана дэклярацыя новага ўраду.

Супроць інтэрвэнцыі ў Кітаі.

ДЭМАНСТРАЦЫІ ПРАТЭСТУ У АНГЛІІ.

ЛЁНДАН, 28. На 6-га лютага па ўсім краі назначаны дэманстрацыі пратэсту супроць умешваньня ва ўнутраныя справы Кітаю.

НЕЗАЛЕЖНАЯ РАБОЧАЯ ПАРТЫЯ КАПІТУЛЮЕ.

ЛЁНДАН, 28. Выканком незалежнае рабочае партыі тэлеграфаваў кантонскаму міністру замежных спраў Чэну, што ён далучаецца да рэзалюцыі аб'яднанае нацыянальнае рады. Незалежная рабочая партыя не будзе арганізоўваць асобных мітынгаў 6-га лютага.

Такім чынам, больш энэргічная палітыка, намечаная ў дэклярацыі незалежнае рабочае партыі, пазбаўлена ўсякае моцы, паколькі гэтая партыя далучылася да рэзалюцыі аб'яднанае нацыянальнае рады.

ЗАКЛІК МІЖНАРОДНАГА К-ТУ ПРАПАГАНДЫ ТРАНСПАРТНІКАЎ.

МАСКВА, 28-1. Міжнародны камітэт прапаганды і дзеяньня транспартнікаў зьвярнуўся да маракоў і рабочых партоў з адозваю, у якой прапануе спыніць перавозку войска, зброі і амуніцыі, якія накіроўваюцца імпэрыялістычнымі ўрадамі ў Кітай для прыдушэньня кітайскага вызваленчага руху.

СІЛАЮ АНГЛІЯ НІЧОГА НЕ ДАБ'ЕЦЦА.

Водгукі францускае прэсы.

ПАРЫЖ, 28-І, Газэта „Эр Нувэль“ піша так: „Посьпехі кантонцаў пакуль-што не паставілі пад пагрозу ні жыцьця ні маёмасьці ангельцаў. Кантонцы даказалі сваю здольнасьць падтрымліваць парадак у эўрапейскім квартале Ханькоу. Калі ангельцы будуць сілаю супярэчыць ажыцьцяўленьню патрабаваньняў паўднёўцаў аб мытнай аўтаноміі і скасаваньні спэцыяльных правоў чужаземцаў, дык яны напаткаюць супярэчаньне ўсяго Кітаю. У інтарэсах міру ангельцы павінны дагаварыцца з Кітаем“.

Згодніцкі Інтэрнацыянал у дудку з імпэрыялістамі.

БЭРЛІН, 24-1. У Брусэлі склікаецца кангрэс „лігі барацьбы проці прыгнечаньня каляніяльных народаў.

Орган II Інтэрнацыяналу «Міжнародная інфармацыя сацыялістычнага рабочага «Інтэрнацыяналу» выступіў з вострымі выпадамі проці кангрэсу, зацьвярджаючы, што «ліга барацьбы проці прыгнечаньня каляніяльных народаў зьяўляецца сьцягам для прыкрыцьця камуністаў».

50000-ыя мітынгі памяці Леніна ў Кантоне.

КАНТОН, 24. 22-га студзеня ў Кантоне на пляцы Сун-ят-сенаўскага ўнівэрсытэту адбыліся шматлюдныя жалобныя мітынгі з прычыны трэцяе гадавіны сьмерці Леніна. На мітынгах прысутнічала больш 50.000 чалавек. Члены кантонскага ўраду і розных палітычных і грамадзкіх арганізацый у прамовах заклікалі да барацьбы за сусьветную рэвалюцыю, за вызваленьне прыгнечаных народаў і супроць імпэрыялізму.

У працягу ўсяго вечару, да паўночы, з трыбун у розных частках гораду рабіліся прамовы і даклады.

Устанаўленьне дадатковых мытаў у Мукдэне.

ХАРБІН, 28-І. Агенцтва Тохо паведамляе, што галоўнае камандаваньне арміі нацыянальнага ўміратварэньня загадала ўвесьці з 1-га лютага ў моц пастанову пекінскага ўраду аб спаганяньні дадатковых мытаў.

Дадатковыя мыты будуць спаганяцца ў Мукдэне, Харбіне і Дайрэне.

У загадзе зазначана, што пратэст з боку Японіі не павінен перашкодзіць спагнаньню мытаў.

Нячуваны ўціск пілсудчынай працоўных Заходняй Беларусі.

Рабочыя і сяляне БССР пратэстуюць супроць гвалтаў у Заходняй Беларусі і арганізуюць дапамогу вязьням польскіх турмаў і іх сем'ям.

Сэкратарыят Грамады яшчэ не працуе.

Фашысцкі тэрор не падарваў настрою працоўных мас.

Вострыя спрэчкі ў польскім сойме.

ВАРШАВА, 28. Агульныя спрэчкі аб бюджэце ў польскім сойме скончыліся. Апошнімі ў спрэчках выступалі—адзіны з застаўленых на волі дэпутатаў Беларускае Грамады Сабалеўскі і камуністычны дэпутат Варскі.

ПРАМОВА ДЭПУТАТА ГРАМАДАЎЦА САБАЛЕЎСКАГА.

«У якасьці прадстаўніка шматмільённага беларускага народу,—заявіў Сабалеўскі,—я абвінавачваю польскі ўрад з гэтай трыбуны ў падрыхтоўцы ў працягу шмат якіх месяцаў разгрому самае магутнае арганізацыі працоўнага беларускага народу. Я абвінавачваю польскі ўрад і Пілсудзкага ў тым, што яны ўтварылі ў Нясьвіжы ўгавор з польскімі абшарнікамі векавымі прыгнятацелямі беларускага народу, што яны гарантавалі абшарнікам прыдушэньне вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі.

Уся Заходняя Беларусь уяўляе сабой адну вялікую турму. У Заходняй Беларусі ёсьць воласьці, 60 проц. насельніцтва якіх перабывала ў турмах. Польскі буржуазны друк крычыць аб уплыве менскага камунізму на польскіх ускраінах. Я не скажу, што гэта няверна: гэты ўплыў існуе і павялічваецца з кожным днём. Уплыў Грамады, якая стала выразнікам патрэб беларускага народу, павялічваўся з страшэннаю сілаю. У той-жа час на Грамаду абвалілася лавіна паклёпу і правакацыі.

Я пытаюся, дзе матар'ялы, дзе доказы, дзе аружжа, дзе сьведкі нашых змоваў? Нас абвінавачваюць у тым, што мы вялі сваю працу на грошы заграмнічнага пахаджэньня. Але я сьцьвярджаю, што кожны другі, нават патраціўшы значна больш грошай, ня здолее арганізаваць хоць-бы 500 сумленных пасьлядоўцаў сучаснага ладу на ўсходніх крэсах Польшчы. Паўлюкевіч адкрыта браў грошы ад віленскага ваяводы Рачкевіча для арганізацыі процідзеяньня Грамадзе. Не зважаючы на гэта, Паўлюкевічу нічога не ўдалося зрабіць, і яго выступленьні выклікаюць толькі сьмех. Шкода грошай на гэтую правакацыйную працу».

«Адных зарэгістраваных членаў Беларускай Грамады—прадаўжаў Сабалеўскі,—маецца 100.000, а да ліку пасьлядоўцаў Грамады трэба аднесьці ня менш 70 проц. усяго беларускага насельніцтва. Я папярэджваю, што адказнасьць за вынікі вашае шалёнае палітыкі ў адносінах да беларускага народу звалiцца не на нас. Мы дамагаліся арганізавана ахапіць стыхійнае імкненьне мас да волі. Вы разбураеце нашу арганізацыю».

ВЫСТУПЛЕНЬНЕ КАМУНІСТЫЧНАГА ДЭПУТАТА ВАРСКАГА.

Выступіўшы пасьля Сабалеўскага камуністычны дэпутат Варскі адзначыў, што апошнія арышты ў Заходняй Беларусі, накіраваны ня толькі супроць камуністаў, але і супроць усяго працоўнага беларускага народу. Аднак, тэрор польскай акупацыі не падарваў настрою працоўных мас. Камуністычная фракцыя сойму лічыць сваім абавязкам канстатаваць, што гвалты, якія нагадваюць горшыя часы расейскае акупацыі, адбываюцца таксама і ў Заходняй Украіне. Камуністычная фракцыя канстатуе, што палітыка прыдушэньня нацыянальнага руху праводзіцца ня толькі ў інтарэсах акраінных абшарнікаў, але мае мэтаю вызваленьне пляцдарму і забясьпечаньне магчымасьці новага паходу на Менск і Кіеў.

Адозва дэпутата Грамады Ю. Сабалеўскага.

Дэпутат Беларускае Грамады Ю. Сабалеўскі, які ў гэты момант адзін толькі паміж дэпутатаў-грамадаўцаў застаўся на волі, выпусьціў адозву, дзе, паміж іншым, гаворыцца:

„Ужо даўно ўлада старалася зьліквідаваць Грамаду, якая згуртавала ў сваіх радох сялян і рабочых Заходняе Беларусі дзеля змаганьня за нацыянальныя правы, за права на зямлю, на людзкае жыцьцё і палітычную волю'

У пачатку ўлада старалася аслабіць уплывы Грамады і стварыць іншыя канкурэнцыйныя «беларускія» партыі. Думка ўтварэньня ўрадавай партыі Паўлюкевіча зусім не ўдалася. Другія партыі, як хадэкі і Сялянскі Саюз Яроміча, маюць зусім малыя ўплывы. Грамада згуртавала пад сваім сьцягам 90 тысяч з'арганізаваных сяброў і стаіць на шляху да здабыцьця манаполіі палітычнага ўплыву ў Зах. Беларусі".

Далей дэпутат Сабалеўскі разьбівае ўсе апошнія брахлівыя паведамленьні польскага нацыяналістычнага друку аб няіснуючых доказах «віны» беларускіх дэпутатаў і грамадзкіх дзеячоў і канчае сваю адозву наступнай заявай:

«Дзеля замаскаваньня сапраўднага зьместу нацыянальнага ўціску, злучаюць выпадкі ў Заходняй Беларусі з арыштамі ў Пазнані і Варшаве, выклікаючы гэтым палітычную нервазбярыху. Гэта—прастацкае абрабленьне грамадзкае думкі, вытварэньне фальшывага фону, каб апраўдаць учыненыя акты ламаньня канстытуцыі і нацыянальнага ўціску».

У Цэнтральным сэкратарыяце Грамады.

Цэнтральны сэкратарыят Беларускае Сялянска-Рабочае Грамады афіцыйна лічыцца не зачыненым, але ў сьвязку з тым, што паліцэйская варта з памяшканьня сэкратарыяту яшчэ ня зьнята, нармальная праца сэкратарыяту аднавіцца яшчэ не магла.

Пратэст камуністычнае фракцыі францускага парляманту.

ПАРЫЖ, 28-1. Камуністычная фракцыя палаты дэпутатаў паслала польскаму ўраду пратэст процi арышту беларускіх дэпутатаў, патрабуючы зараз-жа іх вызваліць.

Эндэцкі законапраэкт супроць камуністаў.

ВАРШАВА, 28. Эндэкі распрацавалі законапраэкт аб выключных мерапрыёмствах супроць камуністаў. Законапраэкт прадугледжвае, што «члены забароненых партый» ня могуць займаць выбарныя пасады ў камунальных і законадаўчых установах.

Праэкт падаецца ў сойм.

Справа 27-мі беларускіх сялян.

У Берасьцейскім акруговым судзе пачаўся 25 студзеня разгляд справы 27-мі беларускіх сялян, арыштаваных у вёсцы Малорыцьце і яе ваколіцах па падазрэньню ў прыналежнасьці да кампартыі.

Сярод арыштаваных знаходзяцца Міхась Тарасевіч, Міхась Казак, Эўгені Камяньчук, Павал Струк, Ігнат Трус і іншыя.

Выклікана агулам 65 сьведак, большасьць якіх зьяўляецца агентамі дэфензывы.

КАНФІСКАЦЫЯ БЕЛАРУСКАЕ ГАЗЭТЫ.

Згодна распараджэньня адміністрацыйнае ўлады, канфіскаваны № 1-шы новае беларускае газэты пад назваю: «Наш Голас».

Прычына канфіскацыі—процідзяржаўны зьмест.

Рэдактар газэты прыцягнуты да судовае адказнасьці.

АНДРЭЙ АЛЕКСАНДРОВІЧ.

Фабрыка сьмерці.

Сучасны лад у Польшчы зьдзекамі і катаваньнем працоўных Заходняй Беларусі перасягнуў былую царскую Расею.

З газэт.

Краіна родная!.. Дарогі крыжавыя,
скажыце гоманам нахмураных прысад;
—Глумілі нас фэльдфэбелі Расеі,
як быццам поле ў буру буйны град.

Дарыла торбы нам жабрачыя, дарыла
„культура" чорная разьюшаных баяр.
На струны з нас зьдзіралі нашы жылы,
сьмакталі кроў памешчык і жандар.

Сьвету яснага ня бачыў край вякамі,
грудзі кволыя сьціскаў халодны мур.
Слова роднае закоўвалася ў камень;
народ наш знаў турму і сьмертны шнур.

Прайшлі гады... Народ з няволі выйшаў.
Жыцьцё інакшае спаткала Беларусь!
Але мы помнім, помнім на Лукішках
быў павешаны адважны наш Кастусь.

І сёньня... Там... У загранічных ботах
жандары-найміты крываваю разьнёй
нашых змучаных братоў за польскі „злоты"
зьвярына катуюць начінуўшысь грунём.

Зарасьлі былі сьляды баяр праклятых,
загінуў бляск фэльдфэбэльскіх пагон.
А сёньня... Там... будуюць казематы!
А сёньня... там... наведамы прыгон!

Па сьпінах мужыкоў ангельскі сьвішча
шомпал,
гуляе паншчына—пракляты чорнацьвет!
Чаго-ж маўчыць культурная Эўропа?
Крык зьняволеных даносіцца ў сусьвет!

Зноў лукіскіх камер не хапае,
Зноў шляхі афарбавала кроў...
Што-ж паноў разьюшаных стрымае?
Правіць турмамі Пілсудзкі-Мураўёў!

Але шляхі ня зжыць ім і крывёю;
народзіць Воля новы, сьветлы дзень
і радасьць сьветлую, новы дзень з сабою
братом прыгнечаным адважна прывядзе...

... Краіна родная! Дарогі крыжавыя,
гудзіце гоманам нахмураных прысад.
Польшча сёньня—як царская Расея—
краіна сьмерці! Краіна цёмных крат!

К-ты сялянскае узаемадапамогі дапамогуць.

Белапалякаў у нас на левым беразе Дняпра ў 1920 годзе ня было. Дзякуй за гэта нашай Чырвонай арміі. Але наша сялянства добра ведае, як дрэнна жыць пад панскім бізуном.

Чулі мы, што ў Заходняй Беларусі вялікі голад,—бадай такі, як у нас быў на Волзе 4 гады таму назад. Мы павінны абавязкова дапамагчы галадуючым, бо тысячы народу гатовы памерці. У справу дапамогі галадуючым трэба ўцягнуць камітэты сялянскай узаемадапамогі.

У той вёсцы, дзе я жыву, сёлета быў недарод. Ярына зусім прапала. Але я лічу, што ўсякі з беднякоў і з серадьнякоў па меры магчымасьці адгукнецца на гэту справу. «С миру по нитке—голому рубашка». Вось і адратуем на нашы ахвяраваньні некалькі душ ад галоднай сьмерці.

Збожжам наша сялянства ня можа дапамагчы, але палатном, салам, мо' чым яшчэ іншым гэта—можна.

(Козыраў, селянін Дупалаўскага раёну, Магілёўскай акругі).

Працаўнікі мастацтва—на дапамогу палітычным вязьням Зах. Беларусі.

Агульны сход працаўнікоў Беларускага Першага Дзяржаўнага Тэатру 29 студзеня г. г., заслухаўшы інфармацыю т. т. Славінскага і Баліцкага аб разгроме Беларускай Грамады і фашысцкай расправе над палітычнымі і грамадзкімі дзеячамі Зах. Беларусі, выказвае свой гарачы пратэст супроць агіднай фашысцкай палітыкі ўраду Пілсудзкага, накіраванай на зьнішчэньне беларускага культурнага і нацыянальнага руху. Мы ў гэтым прадугледжваем падрыхтоўку тылу для нападу на БССР і СССР.

Ня гледзячы на гвалт і зьдзекі, якія чыніць польская фашысцкая ўлада над рабочымі і сялянамі Зах. Беларусі, мы цьвёрда верым, што ня ўдасца польскай буржуазіі задушыць рэвалюцыйны рух беларускіх працоўных за сваё вызваленьне.

У знак братэрскай салідарнасьці агульны сход пастанаўляе: арганізаваць у дзень нашага адпачынку, у панядзелак 31 студзеня, спэктакль на карысьць палітычных вязьняў і іх сем'яў і выклікаем гэта зрабіць працаўнікоў Яўрэйскага Дзяржаўнага Беларускага Тэатру, Белдзяржкіно, Беларускі Другі Дзярж. Тэатр у Віцебску, а таксама ўсіх працаўнікоў мастацтва БССР.

Далоў гвалтоўнікаў і ўціскацеляў нацыянальных меншасьцяў!

Далоў фашызм!

Няхай жыве салідарнасьць усіх працоўных!

Няхай жыве камуністычная партыя Заходняй Беларусі!

Супроць белапанскага тэрору ў Зах. Беларусі.

(Гомель).

Рабочыя буйнейшых прадпрыёмстваў Гомелю і Нова-Беліцы на шматлюдных сходах выказалі пратэст супроць нячуванага гвалту польскіх жандараў над рабочымі і сялянамі Заходняе Беларусі.

РАЗГРОМ „ГРАМАДЫ" І РАСЕЙСКІЯ БЕЛАГВАРДЗЕЙЦЫ.

У нас яшчэ няма поўных вестак аб водгуках расейскае белагвардзейскае эміграцыі на разгон польскім фашызмам арганізаванага палітычнага прадстаўніцтва заходне-беларускіх працоўных масаў—«Беларускае Сялянска-Работніцкае Грамады". Але некалькі галасоў ёсьць, і іх варта падаць да ведама рабоча-сялянскае грамадзкасьці Савецкае Беларусі.

Найперш за ўсё трэба адзначыць, што нават «сацыялістычная» частка расейскае эміграцыі ня хоча прызнаваць самага існаваньня беларусаў, як асобнае нацыянальнасьці. Дзеля прыкладу можна ўспамянуць аб нашумеўшых у свой час выступленьнях былага міністра часовага ўраду Пракаповіча ў эсэраўскай газэтцы «Дни" (за 28-XII-24 г.), якая яшчэ да гэтага году выдавалася ў Парыжы. Памянёны Пракаповіч даводзіў, што на ўсходніх ускраінах Польшчы жыве некалькі мільёнаў расейцаў, што расейцы там складаюць да 80 проц. насельнасьці, так што ні беларусаў, ні ўкраінцаў—там не аказалася.

Тэорыя аб мільёнавым расейскім насельніцтве ўсходніх ускраін Польшчы доўгі час карысталася асаблівою прыхільнасьцю расейскае белагвардзейскае газэткі „За свободу", якая была заснавана ў Варшаве нябожчыкам Б. Савінкавым і выходзіць аж дагэтуль. Газэта доўгі час не хацела прызнаваць беларусаў і толькі ў апошнія пару гадоў у ёй прымячаецца невялікая зьмена: беларусы ёю прызнаюцца, але беларусы тыпу Паўлюкевіча і яму падобных. З усім-жа сапраўдна-беларускім газэтка, выпаўняючы сацыяльны заказ сваіх варшаўскіх хлебадаўцаў, вядзе паранейшаму зацятую барацьбу.

Што датычыць правых, чорнасоценных эміграцкіх газэтаў, дык аб іх адносінах да беларусаў наогул і да беларусаў у Польшчы ў асобку можна і не гаварыць. Яны рэзка-варожыя.

„За свободу" спаткала паход на „Грамаду" з вялікай радасьцяй, паўтараючы ўрадавую бязглуздзіцу, што гурткі „Грамады" аказаліся кам'ячэйкамі, што „Грамада" мела на сваім банкаўскім рахунку паўмільёна злотых і г. д.

Толькі праз некалькі дзён пасьля масавых арыштаў у нумары за 20 студзеня г. г. „За свободу" палічыла патрэбным туманна выказацца наконт таго, што барацьба з бальшавізмам поўна-ж павінна праводзіцца з усёю энэргіяй, але ня трэба

„наносіць удараў на зусім здароваму імкненьню беларускае нацменшасьці захаваць сваю культуру, свой нацыянальны твар у законных рамках польскае дзяржаўнасьці".

Гэтыя словы якраз згаджаюцца з тою лініяй, якую ў адносінах да беларусаў праводзіць так званы „дэмакратычны" польскі друк. Побач з душэньнем тых элемэнтаў беларускага руху, якія не згаджаюцца падпарадкавацца польскай буржуазіі, трэба падкормліваць „беларусаў" тыпу Паўлюкевіча і кампаніі, трэба іосьці на спатканьне „дзеячом" з „сялянскага саюзу" і „хадэкі", якія таксама схільны да аддачы сябе ў арэнду польскай буржуазіі.

Увесь-жа артыкул „За свободу" тужыцца давесьці, што беларускі нацыянальны рух у Заходняй Беларусі знаходзіцца пад моцным уплывам бальшавікоў і Камінтэрну і што паліцэйскі наскок на „Грамаду" абгрунтаваны. Ад утрыманкі польскае буржуазіі іншага і чакаць ня прыходзіцца.

Таксама рыская расейская газэта „Сегодня" (20-1), прыймае, што „Грамада" знаходзілася пад камуністычным уплывам, хоць робіць гэта з некаторымі агаворкамі.

„Беларуская Грамада" будавалася пад чыста—нацыянальным сьцягам. У яе складзе ёсьць бязумоўна элементы чужыя камунізму. Але левыя і іменна сацыялістычныя элементы пераважваюць".

І ў другім месцы:

„Як відаць, «Грамада» не праповедвала беспасрэдна камунізму, але бязсумліўна, што камуністы знаходзілі лёгкі (і нават гасьцінны) доступ у яе і дзейнічалі пад сьцягам гэтага легалізаванага таварыства".

„Сегодня" са здавальненьнем адзначае, што

«цяпер гэтая работа сарвана, і камуністы атрымалі новы сакрушаючы удар. Але ўдар—па іх ласцы—атрымлівае і нацыянальны беларускі рух, які цяпер бязумоўна моцна скампрамэтаваны ды і фізычна, так сказаць, аслаблены, бо, апрача памянёных дэпутатаў, арыштавана шмат другіх беларускіх дзеячоў. Падвойна злачынная работа камуністаў і падвойна злачынныя лёгкадумства беларускіх дзеячоў... І ўсё гэта сталася за некалькі месяцаў да новае выбарнае кампаніі".

„Сегодня", як і другая рыская расейская газэтка „Слово", вяла ў свой час заядлую клеветнічую кампанію процiў латвійскіх беларусаў у часе Дзьвінскага працэсу. Тое, што ўсе наговоры на беларусаў аказаліся брахнёю, ніскольк ня спыняе газэты ад яе цяперашняе брахні на беларускі рух у Польшчы. Разгром беларусаў, дзе бы то ні было, расейскія як і беларускія белагвардзейцы лічаць сваім здабыткам, расчышчэньнем поля дзеля іх дзейнасьці.

Асаблівую цікавасьць у зьвязку з разгромам «Грамады» набірае тое, што пісаў правакадзецкі „Руль" пару месяцаў таму назад, калі польскі буржуазны друк праводзіў папярэднюю падгатоўчую атаку на «Грамаду». Артыкул „Пагроза бальшавізму", зьмешчаны ў «Рулі» за 20 лістапада 1926 г., ясна выяўляе тыя надзеі, якія ўскладаюцца расейскай белагвардзейшчынай на разгром «Грамады» і наогул беларускага культурна-нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі.

«Руль» сваім нюхам ужо тагды адчуваў, да чаго імкнецца і да чаго прывядзе атака польскага буржуазнага друку на „Грамаду" і сьпяшаўся з свайго боку ўткнуць свае тры грошы, дапамагчы разгрому ненавіснага расейскай белагвардзейшчыне беларускага нацыянальнага руху. Дзеля гэтага «Руль» цалкам падтрымлівае тыя брахлівыя абвінавачаньні „Грамады" ў камунізьме, якія пашыраліся польскім буржуазным друкам, Не бяда, што гэта фальш, мана! Абы толькі дапамагло задушэньню беларускага руху.

«Руль» характарызуе «Грамаду, як рэвалюцыйную і сэпаратыстычную арганізацыю.

«Адзін факт бязсумліўны"—зьяўляе „Руль", пішучы аб пераўвялічаных трывогах польскага друку—„дагэтуль інэртная і палітычна маласьвядомая праваслаўная сялянская насельнасьць усходніх ваяводстваў Польшчы ўсё болей падпадае пад уплыў рэвалюцыйных арганізацыяў, якія высоўваюць прынадныя лёзунгі агульнае роўнасьці, выганьня „паноў" і падзелу ўсяе зямлі „паміж працоўнымі"... На паўночным усходзе Польшчы прапаганда гэтая вядзецца нават легальна, пад сьцягам памянёнае рабоча-сялянскае грамады" і злучаючыся з ледзь хаваемымі сэпаратыстычнымі імкненьнямі".

„Руль" тужыцца давесьці, што ўся бяда Польшчы ва ўсходніх ваяводствах зьмяшчаецца ў падрыве польскаю-ж уладаю значэньня праваслаўнае расейскае царквы і расейскае школы:

„атрута бальшавіцкае агітацыі таму і змагла бяскарна прышчапляцца сярод праваслаўнае насельнасьці Польшчы, што рукою ўлады былі зьнішчаны процiатруты, якія можна было ёй процiпаставіць".

Праўда, царква і школа існуюць, але яны пазбаўлены значэньня:

„Польская палітыка зрабіла спробу замяніць расейскую школу на вёсцы польскаю, украінскаю і беларускаю (? Мы дагэтуль ня чулі, каб польская ўлада адчыняла беларускія школы. Як раз наадварот. М. С.). У выніку гэтае спробы расейская школа, праўда, перастала існаваць, але новыя не карыстаецца ў вачох насельнасьці ні аўтарытэтам, ні ўплывам. У тых-жа мясцох, дзе ўкраінізатарскія і беларусізатарскія ўхілы польскае палітыкі прыняліся,—яны толькі йграюць на-руку прапагандзе бальшавізму і сэпаратызму. Расейскага бальшавізму на ўсходніх акраінах Польшчы няма. Ёсьць бальшавізм украінскі і бальшавізм беларускі".

«Руль» угаварвае Польшчу, што ўкраінскі і беларускі рух—гэта бальшавізм і што найлепшаю запораю процiў бальшавізму будзе захаваньне на ўсходніх акраінах Польшчы расейскае культуры. „Руль" спадзяецца, што Польшча адпаведна зьменіць сваю палітыку.

Такім чынам, расейскія белагвардзейцы набіваюцца ў хаўрусьнікі польскаму фашызму па часьці душэньня беларускага (як і ўкраінскага) нацыянальнага і сацыяльнага руху ў Заходняй Беларусі. Нянавісьць да беларускага сялянства сярод расейскае буржуазіі аказваецца мацнейшаю, чым яе варожасьць да Польшчы. Недабіткі расейскае буржуазіі прапануюць свае паслугі польскім панам дзеля барацьбы з беларускімі працоўнымі масамі.

Пры гэтым расейская белагвардзейшчына карыстаецца тымі-ж самымі мэтадамі брахні, сьвядомага перакручваньня фактаў, як гэта робіць польская буржуазія. Што за бяда, што праграма і інструкцыі «Грамады» не даюць дзеля гэтага падставы? У барацьбе з працоўнымі ілжа, брахня, правакацыя—улюбёная зброя буржуазіі.

Але працоўныя масы добра ведаюць, што ў Польшчы адбываецца разгром беларускага нацыянальнага руху, адбываецца ўціск беларускай нац. меншасьці.

М. С.

ПРАТЭСТЫ, УЗНОСЫ, ВЫКЛІКІ.

Мы рабочыя члены 6-ай арцелі па вырабу абуцьця пры Менскім савеце інвалідняга кааперацыйнага аб'яднаньня, члены Мопр'у, катэгарычна пратэстуем супроць фашысцкага тэрору ў Заходняй Беларусі, пасылаем братэрскае прывітаньне ўсім вызваленым у польскіх турмах сынам працоўных Заходняй Беларусі і Польшчы. Аднача сова з гэтым уносім у фонд дапамогі галадуючым братом Заходняй Беларусі дваццаць пяць рублёў (25 руб.) і выклікаем 5-ю арцель і шавецкую майстэрню МСІКА.

Члены 6-ай арцелі інвалідаў пры МСІКА.

Калектыў служачых Лесбелу супольна з цэнтр. праўл. саюзу дрэваапрацоўнікаў, уносіць на карысьць вызваленых польскімі фашыстамі рабочых і сялян Зах. Беларусі 30 руб. 20 к. і выклікае для аказаньня дапамогі іншыя трэсты ВСНГ БССР, Украінлес і цэнтр. праўл. саюзу прац. зямлі і лесу.

Я, дэлегатка, ад жанслужачых НКЮ Ляхаўскага раёну, Карначова Тацяна, уношу на карысьць палітвызваленых рэвалюцыянэраў у польскіх турмах 3 руб. і выклікаю пасьледаваць майму прыкладу жонак камуністаў НКЮ.

Агульны сход Н.-Агародніцкай яч. КП(б)Б, Слуцкага р., сумесна з рабочым саўгасу «Івань» і сялянамі акружаючых вёсак у ліку 40 чал., заслухаўшы даклад т. Савініча аб крывавым тэроры ў белапанскай Польшчы—рашуча пратэстуе супроць арыштаў і зьдзекаў над дэпутатамі «Беларуская Сялянска-Работнічай Грамады», і рэвалюцыйнымі рабочымі і сялянамі Заходняй Беларусі і Польшчы.

Сход вітае барацьбу рабочых і сялян Заходняй Беларусі і Польшчы і ўпэўнен у тым, што яны перамогуць.

Калектыў служачых Белсельбанку і Беларускай ашчаднай касы пратэстуюць супроць зьдзекаў польскіх паноў над беларускімі рабочымі і сялянамі, масавых арыштаў і зруйнаваньня беларускіх арганізацый.

У рэзалюцыі сход зазначыў:

— Мы верым, што нядоўга засталося польскім панам зьдзекавацца над беларускім працоўным людам, бо агульны рэвалюцыйны рух у хуткім часе спыніць гэтыя зьдзекі.

Сход пастанавіў зрабіць аднача сова 0,5 проц. адлічэньне з месячнага акладу пэнсіі ў карысьць галадаючых Заходняе Беларусі.

Дэлегацкі сход Ляхаўскага раёну ганьбуе панскі ўрад Польшчы, які пасадзіў за краты астрогаў дзесяткі тысяч рабочых і сялян.

Хаўрусьнікам Пілсудзкага ня ўдасца праз астрогі, голад сем'яў і дзяцей вызваленых Заходняе Беларусі зьнішчыць рэвалюц. рух рабочых і сялян.

—Наш дэлегацкі сход, гаворыцца ў прынятай рэзалюцыі,—ні на адну хвіліну не забудзе пра 16 тысяч вызваленых у астрогах Польшчы і Заходняй Беларусі.

Сход унёс аднача сова 8 р. 20 к. і заклікае ўзяць прыклад гарадзкім дэлегацкім сходам Віцебску і Гомелю.

У Саюзных Рэспубліках.

Удзел кааперацыі ў правядзеньні міжнароднага жаночага дню.

МАСКВА, 29-1. Цэнтрасаюз прапануе ўсім спажывецкім кааперацыям узяць актыўны ўдзел у правядзеньні міжнароднага жаночага дню 8-га сакавіка. Кампанія ў асноўным будзе складацца з уцягненьня працоўных жанчын у кааперацыйнае будаўніцтва. Раіцца ўсіх жанчын-практыкантак па магчымасьці перавесьці на пастаянную працу ў кааперацыі. Для жанчын павінны быць вылучаны спэцыяльныя стыпэндыі ў кааперацыйных вышэйшых навучальных установах і тэхнікумах. Пры разьмеркаваньні прыбыткаў Цэнтрасаюз раіць адлічаць сродкі ў фонд кааператаваньня бяднейшых сялянак і малазабясьпечаных работніц. За кошт фондаў быту належыць арганізаваць дзіцячыя яслі, кансультацыі, харчоўні імя „Восьмага сакавіка“ і інш.

Сябры ЦК УсеКП на ленінградзкіх заводах і ўстановах.

ЛЕНІНГРАД, 23-1. Тав. Бухарын наведаўся ў расейскі музэй, дзе аглядзеў выстаўку малюнкаў Сурыкава. Адгэтуль ён накіраваўся ў памяшканьне былага графа Шарамецева, дзе знаходзіцца аддзяленьне расейскага музэю.

Т. т. Рудзутак і Угланаў наведаліся на Балтыцкі завод і завод імя Кавіцкага.

Т. Яраслаўскі быў на заводзе «Бальшавік“, дзе знаёміўся з вытворчасьцю.

На сходзе, прысьвечаным пытаньню аб перавыбарах савету, т. Яраслаўскі выступіў з кароткаю прамоваю. Рабочыя на сходзе заявілі, што ў асобе рабочых заводу „Бальшавік“ партыя ў любы момант знойдзе перадавы атрад рабочае класы.

Сход паслаў прывітаньне ЦК і ЦКК УсеКП(б).

Савецка-турэцкая вэтэрынарная канвэнцыя.

ТЫФЛІС, 29-1. У Батуме скончана праца савецка-турэцкае вэтэрынарнае канфэрэнцыі.

28-га студзеня за ўрачыстых абставінах адбыўся акт падпісаньня ўгавору з 35-ці пунктаў, напісанага ў 2-х адбітках на француской мове.

Пасьля падпісаньня ўгавору прадстаўнікі СССР і Турцыі абмяняліся прывітальнымі прамовамі і выказалі пажаданьне як мага хутчэй зьдзейсьніць выпрацаваныя на канфэрэнцыі мерапрыёмствы.

25000 выйгрыш.

МАСКВА, 26-1. Выйгрыш у 25 тысяч рублёў на першым тыражы (які адбыўся ў Маскве) выйгрышаў пазыкі 1926 году прыпаў на абліґацыю грамадзянкі Леў. Яна—ўдава і служыць у адной з маскоўскіх галянтарэйных крам.

Рэйс аграпоезду імя Леніна.

МАСКВА, 29-1. 8-га лютага аграпоезд імя Леніна выходзіць у рэйс па Сталінградзкай і Варонескай губэрнях.

Рэйс прадоўжыцца паўтара месяцы.

Адпор кулаком у перавыбарах саветаў.

НОЎГАРАД, 26-1. У некаторых выбарчых раёнах кулакі спрабавалі спойваць беднату гарэлкаю, а папы прыстасоўвалі пахаваньне да дню выбараў, каб гэтым адцягнуць сялянства ад удзелу ў выбарах. Аднак, гэтыя махінацыі ня мелі посьпеху і беднята, выступаючы на выбарах адзіным фронтам з серадняком, з посьпехам праводзіць у сельсаветы сваіх кандыдатаў.

Сродкі на разьвіцьцё лоявае прамысловасьці ў РСФСР.

МАСКВА. Прэзыдыум Дзяржпляну РСФСР зацьвердзіў праграму лоявае прамысловасьці на 1926-27 год у разьмеры 85.300.000 руб. фабрычнага сабекошту. Плян капітальных работ зацьверджан у суме 3.135.000 р., з іх на новае будаўніцтва адпушчаецца 870.000 руб.

У зьвязку з высокім сабекоштам вырабаў лоявае прамысловасьці Дзяржплан запрапанаваў ВСНГ РСФСР распрацаваць мерапрыёмствы для зьніжэньня сабекошту.

Пашырэньне пасадак хмелю ў РСФСР.

МАСКВА. У багучым годзе Наркамзем РСФСР адчыняе 8 практычна-паказальных хмельнікаў, якія будуць дастаўляць насельніцтву пасадачны матар'ял. Устанаўляецца пасада спэцыялістаў-хмеляводаў для інструктаваньня сялянства.

Багатыя сьлюдзяныя местароды.

НОВАСІБІРСК, 28-1. Меркаваньне аб багатых залежах сьлюды ў Бадайбінскім раёне апраўдалася. Дасьледаваньне сьлюды, узятае з Мамскага местароду, экспэдыцыяй маскоўскага інстытуту прыкладное мінэралёгіі паказала, што якасьць яе значна лепшая, чым якасьць індыйскае сьлюды, якая да гэтага часу лічылася лепшаю ў сьвеце.

Сабекошт сібірскае сьлюды складае 40 рублёў за пуд, у той час, як індыйская сьлюда каштуе 500-1000 рублёў пуд.

ВЕСТКІ АДУСЮЛЬ.

У Англіі засноўваюцца спэцыяльныя атрады паліцыі.

ЛЁНДАН, 23-1. У Гертфордшыры арганізован «спэцыяльны паліцэйскі атрад» лікам у паўтары тысячы чалавек „для дапамогі начальніку мясцовае паліцыі ў тых выпадках, калі апошні будзе лічыць гэта патрэбным».

У склад новага атраду ўваходзяць прадстаўнікі буржуазіі.

Італа-рум. гандлёвыя перамовы.

РЫМ, 27-1. Учора ў Рыме распачаліся перамовы аб падпісаньні італа-румынскага гандлёвага ўгавору.

Выбух у ангельскай капальні.

ЛЁНДАН, 28-1. Выбухам у адной з нанова адчыненых вугальных капальняў у Кенце забіта 4 і паранена 11 чалавек.

ФЭЛЬЕТОН.

АСТРАЛЁГІЯ.

Крыж на небе.

Учора ўвечары жыхары Жолібора (каля Варшавы) ўбачылі на небе выразны знак крыжа. Гэта тлумачылася, як прадказаньне вайны.

Жыхары масамі выходзілі з кватэраў, каб глядзець на гэты запрарочны знак на небе.

(„Газэта Варшавска Поранна“ № 20 за 21-І-27 г.).

Найвялікшымі мудрэцамі старажытных эпохаў былі прарокі. Асабліва паважнае месца сярод гэтых прарокаў займалі прарокі па нябесных справах, гэтак званыя «астралёгі».

Паглядзіць гэткі астралёг на зоркі, зьвічкі і іншыя нябесныя сьвяцілы і адразу-ж скажа чалавеку, што яго чакае, што было, што будзе...

Усё як на далоні.

З часам на зьмену пракокам-астралёгам зьявіліся людзі навукі—астраномы, якія з лічбамі ў руках пачалі выкрываць усе тайны нябесных сьвяцілаў.

Астралёгі надта горача прывіталіся з астраномамі. Вядомага Галілея (які выкрыў „камэту Галілея“) астралёгі жыўцом спалілі на вогнішчы. З іншымі вучонымі астралёгі віталіся ня менш горача.

Большасьць краін і народаў цяпер ужо зусім страцілі веру ў астралёгію.

Найгорш стаіць гэта справа ў бязбожным СССР. Але ёсьць яшчэ на сьвеце краіны, дзе афіцыйная ўлада падтрымоўвае ў насельнасьці веру ў астралёгію. Вось, напрыклад, багамольная Жэчпосполіта ў астралёгію моцна верыць.

І добра робіць.

Я яшчэ таксама веры ў астралёгію ня страціў, бо маю тысячу довадаў, што астралёгія—вялікая нябесная таямніца.

Вось, напрыклад, фараон Эгіпту Рамзэс убачыў калісь на небе дзяўную камату з падвоеным хвастом. І што-ж вы скажаце? Роўна праз 6000 гадоў італьянскаму дыктатару Мусаліні прастрэлілі нос.

Другі факт. У сярэдзіне мая 1924 году было зацьменьне сонца. І вось роўна праз 2 гады гэтае зацьменьне адбілася ў Польшчы, і Пілсудзкі зрабіў свой дварцовы пераварот.

У сучасны момант польскія газэты паведамляюць, што пад небам Жэчыпаспалітай паказаўся знак агнёвага крыжу. Эндэцкія і хадэцкія газэты пішуць, што гэты нябесны крыж прарочыць блізкую вайну.

Гэта ня зусім верна.

Хаця нябесныя знакі заўсёды прарочылі выключна дрэнныя падзеі, на гэты раз трэба спадзявацца добрага здарэньня. Агнёвы крыж усё-ж такі не камэта з падвоеным хвастом.

Усе залежыць ад таго, ў якім напрамку крыж пасоўваўся.

Калі па кірунку «Палярнае Зоркі», то гэта гаворыць за тое, што Польшча атрымае ад Лігі Нацыяў вялікую калёнію на паўночным канцавосьці.

Калі ў напрамку «Малочнага Шляху» то Паўлюкевіч атрымае ў дэфэнзыве новы аванс. Калі крыж пасоўваўся ў іншых напрамках, то гэта прарочыць таксама выключна добрае:

На «Вялікую Мядзьведзіцу»—новыя міністэрскія партфэлі для пэпэсаў.

На «Венеру»—посьпех у прыгожых варшаванак.

На «Марс»—новыя шпоры ў польскіх жандармаў і г. д. і г. д. Усе добрае.

Прашу „Газэту Варшавскую Поранную“ супакоіць сваіх чытачоў.

Юг.

УЛАДАРЫ ШАХТ ПАЧЫНАЮЦЬ ПОМСТУ.

(Ад нашага ангельскага рабкора, атрымана на мове эспэранто).

Цяпер, як скончылася вялікая забастоўка і пачалася на шахтах больш-менш правільная праца, кожны выпадак карыстаюць нашы гаспадары для сваёй помсты.

У горадзе Понтыпрыд (у тым раёне, дзе я працую) адміністратары устаноў дапамогі бедным зрабілі з уладарамі шахт тую ўмову, каб грошы, дадзеныя як дапамога гарнякам у час забастоўкі, былі паступова адабраны ад іх пэнсіі. У выніку кожны прыблізна гарняк у Стайнфорце, працаваўшы 6 дзён, прынес дамоў 1 шылінг і 6 пэнсаў (75 капеек).

А штрайкбрэхеры ў Ангфорне у той жа самы час зарабляюць па 4 рублі ў дзень. Працуючы па 5 дзён у тыдзень, яны зарабляюць прыблізна па 20 рублёў.

Як усім вядома—рабочы дзень павялічыўся да 8 гадзін. Пагэтаму, у выніку такога павялічэньня, вугольныя бароны звольнілі 250.000 горнякоў. У шмат якіх раёнах галодныя гарнякі зноў пагражаюць забастоўкай, бо беспрацоўныя зусім збаўлены права атрымоўваць ад дзяржавы дапамогу.

Даклады з мейсц паказваюць, што ўладары шахт і іх урад імкнуцца адабраць усё дасягненьні гарнякоў, якія былі атрыманы шляхам доўгай барацьбы. Уся барацьба цяпер разьвіваецца па акругах.

Пасьля трох дзён новай працы, калі забастоўка ўжо скончылася, становішча рабочых зрабілася такім дрэнным, што мясцовыя групы настойвалі на склікаваньні акруговага сходу Ланкашырскага саюзу гарнякоў. На сходзе высьветлілася, што ў гэтай акрузе з-за помсты ўладароў шахт з 36.000 гарнякоў было звольнена 10.000. З сяброў рабочых камітэтаў сталі беспрацоўнымі 300 чал. і многія з гаспадароў адкрыта заяўляюць, што працы яны ніколі не атрымаюць.

Як бачыце—барацьба зусім ня скончылася пасьля вялікай забастоўкі; яна толькі пачынаецца, але ў новых формах.

К. Фільдінг.

Кардіфф, Англія.

Міжнароднае становішча.

(Агляд за тыдзень).

І. НАСКОК НА БЕЛАРУСКУЮ ГРАМАДУ—ПАЧАТАК РАЗГРОМУ РАБОЧА-СЯЛЯНСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ У ПОЛЬШЧЫ.—ІІ. КАНЕЦ УРАДАВАГА КРЫЗІСУ Ў НЯМЕЧЧЫНЕ.—ІІІ. БАРАЦЬБА ЗА ШАНХАЙ.

І.

Апошні тыдзень з часу разгрому Беларускае Сялянска-Рабочае Грамады выявіў усю ману і нікчэмнасьць абвінавачых матэр'ялаў, усю неабаснаванасьць—з пункту гледжаньня нават больш радыкальных колаў Польшчы—гэтага акту. Паліцэйска-сьледчым органам не ўдалося знайсьці доказаў, ні «сувязі Грамады з Камінтэрнам і Сялянскім Інтэрнацыяналам», як аб гэтым біла ў званы чорнасоценная прэса, ні, самае „страшэннае“ абвінавачаньне,— «маскоўскіх грошай».

Уся будыніна абвінавачаньня збудавана на пяску, і гэтага ніяк ня [illegible]. Вось чаму, як паведамляюць газэты, нават «сам» пан-маршал Пілсудзкі, баючыся правалу ўсяе гэтае задуманае гульні, у «камуністычную лагрову», напракнуў сваіх стаўленікаў у „ягонай падрыхтаванасьці“ паліцэйска-сьледчага апарату для такога генэральнага наскоку на беларускі рух.

Аднак ня трэба думаць, што буржуазна-панскае правасудзьдзе будзе лічыцца з сапраўдным станам рэчаў. Пачынаючы паход на Грамаду, польскі фашызм ніба добра і тады ведаў аб нездольнасьці гэтае арганізацыі ў прыпісваемых ёй «грахох», ды не за іх паны і «агарод гарадзілі».

Справа ў тым, што гаспадарка Польшчы дыхае на ладан, шмат старых прадпрыёмстваў зачыняецца, расьце беспрацоўе, дзякуючы масаваму спэкулятыўнаму вывазу хлеба з краю, надыходзіць голад. Усякая арганізаванасьць сялянства і рабочае класы ў гэтым разе абавязкова павінна пужаць памешчыкаў і буржуазею выбухам паўстаньня. Прызнаньне замежнымі магнатамі Пілсудзкага сваім героем, пераход прамысловых магнатаў на бок актыўнага падтрыманьня пілсудчыны—усё гэта было першым крокам да наскоку на ўсе без выключэньня арганізацыі рабочых і сялян Польшчы; замацаваньне саюзу пілсудчыны з абшарнікамі Заходняе Беларусі ў Нясьвіжы, а потым на ўсяпольскім памешчыцкім зьезьдзе ў Вільні ўжо тагды сьведчыла, дзе павінен пачацца гэты наскок. Першаю ахвярай „генэральнага“ разгрому арганізаваных рабочых і сялян стала Беларуская Грамада. Яшчэ ў Нясьвіжы і Вільні, польскі Мусаліні, як відаць, абяцаў манархістам расправіцца з беларускімі працоўнымі масамі. Польскі фашызм не пашкадуе нават крапіць непавінную кроў беларускіх рабочых і сялян, каб запужаць, каб прыдушыць усякае супярэчаньне супроць драпежніцтва магнатаў, супроць ажыцьцяўленьня анты-савецкіх плянаў. Манархісты ўжо патрабуюць растрэлу часткі арыштаваных, патрабуюць разгрому украінскіх і іншых рабоча-сялянскіх арганізацый.

Аднак гэтая завдласьць развюшанае рэакцыі, уся вастрыня яе наскоку сьведчыць і аб яе бясьсільлі. Гэта ня зломіць волі працоўных мас у барацьбе за лепшую будучыню.

II

Зацяжны ўрадавы крызіс у Нямеччыне можна лічыць скончаным. На гэты раз ён разьвязваецца ў зусім нечаканай форме. Найцікавей усяго, што меншавікі, выклікаўшыя гэты крызіс, рукою абнаглеўшага капіталу былі адсунуты ад міністэрскіх партфэляў. У лісьце да Маркса прэзыдэнт Гіндэнбург запатрабаваў, каб габінэт быў складзен выключна з прадстаўнікоў буржуазных партый, з чым згадзіўся Маркс і ўся партыя цэнтру. Як бачым буйная буржуазея заявіла вуснамі свайго фельдмаршала-прэзыдэнта сацыял-дэмакратам, што яна абойдзецца зараз без іх. Нават «совгранатная» кампанія не памагла меншавікам; сёньня капіталу не па шляху з меншавіцкімі дэмагогамі, сёньня яму трэба моцныя рукі вольнкмі.

І сапраўды, паварот нямецкага крызісу раней за ўсё сьведчыць аб жаданьні буйнага капіталу ўзяць вострарэакцыйны напрамак. Заснаваньне ўраду ад нацыяналістаў да цэнтру сьведчыць аб пачатку рашучага паходу проці нямецкае рабочае класы, пачатку яшчэ больш вострага нажыму на заработак і рабочы дзень.

У лісьце да Маркса Гіндэнбург заяўляе, што «палітычнае становішча краю патрабуе працаздольнага і моцнага ўраду». Гэта сьведчыць, што паварот прадбачыцца круты, рэакцыйны напрамак палітыкі будзе ўзят адкрыта, а далей гэтага буржуазіі не патрэбна дапамога меншавікоў.

У галіне замежнае палітыкі ўрад буржуазнага блёку зробіць, як відаць таксама востры паварот у бок зблізкэньня з ангельскім імпэрыялізмам і падтрыманьня яго супроцьсавецкіх плянаў.

Мы бачым, што буйны нямецкі капітал па прыкладу сваіх братоў у іншых краёх захацеў «моцнае ўлады». Розьніца ў тым, што там, у іншых краёх, гэтая «моцная ўлада» прыходзіць да кіраваньня праз фашысцкія пераварота, а тут у Нямеччыне скарыстаны так. зв. «канстытуцыйныя сродкі».

Розьніца, як бачым, не вялікая.

III

Учарашнія тэлеграфныя паведамленьні кажуць аб паражэньні войск Сун-Чуан-Фана ў правінцыі Чжэцьзян і аб пасьпешным пасоўваньні кантонцаў да Шанхаю. Разам з гэтым ангельскі імпэрыялізм ня спыняе падрыхтоўкі да справаваньня супроць кантонскага выступленьня і іменна акрав у Шанхаі.

Шанхай—гэта цытадэль імпэрыялістычных дзяржаў у Кітаі. Ён мае надзвычайна вялікае эканамічнае значэньне, паколькі 40 проц. усіх тавараў праходзяць праз Шанхайскі порт. Вось чаму імпэрыялістам непажадана здача Шанхаю кантонскай арміі.

Трэба сказаць, што пагроза інтэрвэнцыі ў Кітаі, і асабліва з боку Шанхаю, зараз існуе ва ўсю сваю вастрату, паколькі ангельскай дыплёматыі ўдалося схіліць некаторыя дзяржавы на пасылку сваіх узброеных марскіх сіл у шанхайскі порт. Аднак, як высьвілася, развыходзіны ў кітайскай палітыцы Англіі і гэтых дзяржаў далёка ня зьнішчаны. Як Амерыка, так і Японія гэтымі днямі заявілі, што яны ня схіляюцца да шырокае інтэрвэнцыі. А гэта—дзяржавы без якіх Англія ня выступіць. Англію іначоў можна лічыць ізаляванаю ў не агрэсыўных плянах. Мала таго, само выступленьне Англіі ў Шанхаі ня спыніць пасьпяхоўнага ходу кітайскае рэвалюцыі, як ня спыніў Кастрычнікавае рэвалюцыі ангельскі дэсант у Архангельску ў 1918 г.

Аднак затрымаць яе ангельская інтэрвэнцыя зможа. Вось чаму задача міжнароднага пралетарыяту і, у першую чаргу, ангельскага—барацьба з імпэрыялістычнымі і контр-рэвалюцыйнымі плянамі ангельскага ўраду. Весткі апошніх дзён сьведчаць, што такая барацьба пачалася. Ангельскі пралетарыят можа і зможа даць адпор усім інтэрвэнцыяналістам.

М. Ч.

ПЕРАВЫБАРЫ САВЕТАУ.

САЮЗ ПРАЛЕТАРЫЯТУ І СЯЛЯНСКАЙ БЕДНАТЫ З СЕРАДНЯКОМ—ПАДСТАВА МАГУТНАСЬЦІ САВЕТАЎ. БУДЗЕМ УЗМАЦНЯЦЬ ГЭТЫ САЮЗ ПАД КІРАЎНІЦТВАМ РАБОЧАЕ КЛЯСЫ.

БАРАЦЬБА ЗА ЎПЛЫЎ У САВЕТАХ.

(З матар'ялаў перавыбарнай кампаніі па Мазыршчыне).

Аб вялікай актыўнасьці насельніцтва ў кампаніі перавыбараў саветаў гэтага году багата гаварылі і пісалі і, бязумоўна, гэтая актыўнасьць параўнаўча з мінулым значна ўзрасла. Але важна падкрэсьліць некалькі момантаў з перавыбарнай кампаніі, якія паказваюць значны пералом у настроях асобных групаў насельніцтва вёскі.

Калі ў мінулых кампаніях у час перавыбараў саветаў барацьба ішла наваколо пасады старшыні і сэкратара, дык у гэтай кампаніі барацьба праходзіць за пашырэньне свайго ўплыву ў саветах тэй ці іншай сацыяльнай групы. Кожная сацыяльная група вёскі зацікаўлена ў тым, каб мець больш сваіх прадстаўнікоў у саветах. Гэты пералом зьяўляецца важнейшым момантам у будучым, бо гэта кажа аб тым, што новыя склады саветаў у будучым будуць самі жтурхаць старшынь і сэкратароў на правядзеньне ўсёй работы калектыўна, а ня так, як гэта праводзілася раней у вялікай частцы саветаў (старшынёю альбо сэкратаром).

Гаворачы аб гэтай барацьбе за ўплыў у саветах, неабходна таксама ўлічыць наступнае: якія-ж групы зьяўляюцца больш моцнымі на гэтых перавыбарах? Паступаючыя зьвесткі з месц гавораць аб тым, што бедната ў гэтым годзе ў большасьці сваёй арганізавана, яна змагла прыцягнуць на свой бок большую частку серадняцтва і разам з імі займае першае месца. Асабліва важна падкрэсьліць, што арганізацыі лесарубаў, ня гледзячы на сваю маладасьць, змаглі ў некаторых мясцох праявіць сябе як пралетарская арганізацыя ў вёсцы, якая ідзе пад кіраўніцтвам партячэек, дапамагчы апошнім на перавыбарах выявіць усе недахваты работы саветаў і ўкамплектаваньню саветаў працаздольнымі вытрыманымі кандыдатурамі.

Вось гэтыя моманты неабходна ўлічыць у мэтах далейшага ажыўленьня работы саветаў, бо вопыт работы паказаў, што там, дзе сельсаветы змаглі ажывіць сваю работу, усім калектывам вырашыць усе важнейшыя пытаньні, разгарнуць работу па гаспадарчаму і культурнаму будаўніцтву вёскі, праводзячы ва ўсёй гэтай рабоце вытрыманую клясавую лінію,—там зацікаўленасьць насельніцтва, актыўнасьць яго вялікая і барацьба за саветы больш абвостраная.

Б. Шпітальнік.

Падрыхтоўка да перавыбараў у Гомельшчыне.

(Дабрушскі раён, Гомельскай акругі).

Справаздачная і падрыхтоўчая кампанія перавыбараў сельсаветаў пачалася ў пачатку студзеня.

20 студзеня на нарадзе ўпаўнаважаных па перавыбарах сельсаветаў пры райкоме КПБ выяўлена, што справаздачная кампанія сельсаветаў праведзена ва ўсіх 20 сёлах. У некаторых сёлах праведзены сходы актыву і беднаты, на якіх абгаварваліся кандыдатуры ў сельсавет, вылучаныя партыйнымі і камсамольскімі арганізацыямі. Партыйныя і камсамольскія арганізацыі актыўна ўдзельнічаюць ва ўсёй падрыхтоўчай працы перавыбарнай кампаніі.

На нарадзе дэтальна быў распрацаван ліст ЦК УсеКП(б), а таксама ліст акругкому аб перавыбарах сельсаветаў, таксама былі абгаворваны тыя няясонасьці і незразуменьні паасобных пунктаў інструкцыі. Напрыклад, у пункце 23 азначана «сельская выбарчая камісія ўтвараецца ў 7 асоб»—ідуць пэрсанальныя пералічэньні, а калі няма камсамольскай ячэйкі, каго ўвесьці, тут трэба было-б агаварыць. У пункце 10 „раёнаая выбарчая камісія ў складзе 9 асоб“—ідуць пералічэньні і выходзіць 10 чал. Гэта таксама няясьнасьць.

Адносна асоб, якія пазбаўлены выбарчых правоў, у пункце 34—в)—сказана „саматужнікі і рамесьнікі..., якія карыстаюцца наёмнай працай аднаго дарослага, або двух вучняў“ не пазбаўляюцца выбарчых правоў. А як вызначыць умовы вытворчасьці, трэба было-б асобнай увагай агаварыць, а то неяк незразумела: шавец, напрыклад, адзін можа шыць боты, а калі ён мае двух вучняў, дык яго быццам трэба пазбавіць права голасу, а ў сапраўднасьці мы пашыраем саматужніцтва дзеля аслабленьня беспрацоўя сярод падросткаў, асабліва дзетдамоў.

Нарада прайшла актыўна, заслуханы даклады. Пасьля азнаямленьня з указаньнямі па перавыбарах, заслуханы інфармацыі кожнага ўпаўнаважанага, растлумачаны ўсе няясонасьці. У прынятых пастановах намечаны папраўкі дапушчаных прабелаў. Нарада разьехалася для сканчэньня падрыхтоўчай кампаніі, якая павінна скончыцца да 31 студзеня, а таксама нарада прыняла пастанову аб неабходнасьці па сканчэньні падрыхтоўчае кампаніі склікаць на 1 лютага нараду ўпаўнаважаных для падрахаваньня вынікаў кампаніі і выпрацоўкі канкрэтнага пляну перавыбараў, якія павінны пачацца 1 лютага і скончыцца 25 лютага.

АГА.

Перавыбары праходзяць дзелавіта.

(Ратамскі сельсавет—Заслаўскі, раён—Менскай акр.).

Перавыбары распачаліся 20 студзеня і маюць быць закончаны каля 30-га студзеня. Зусім ужо інакш праходзяць перавыбары ў Ратамскім сельсавеце. Узмацнілася эканамічнае становішча сялянства—здгэтуль і ўзрост у буйным размаху актыўнасьці пры перавыбарах. Само сялянства патрабуе ўжо для сябе добрых сумленных працаўнікоў, адданых справе, працоўных а не якіх небудзь «партачоў», як заяўляюць самі выбаршчыкі.

— Каб пасьля ня кулацкія, а бядняцка-серадняцкія інтарэсы абараняліся.

На выбарчыя сходы сёлета з кожнай хаты ідзе некалькі чалавек.—У сярэднім 50—60 проц. выбаршчыкаў прысутнічае на выбарах, а летась усяго якіх 30—40 проц. было.

З боку кулакоў ёсьць дзе-ня-дзе патугі ўсунуць свой нос, але ўсе іхныя імкненьні правальваюцца, бо сёлета на сходах бядняκі і серадняκі ідуць цеснай сьцяной. З 12 абраных сяброў сельсавету ў гэтым ліку ні аднаго кулака пакуль што няма, хаця імі Ратамскі сельсавет і багат. Кепска, бязумоўна, тое, што напярэдадні перавыбараў не праведзены па нашаму сельсавету падрыхтоўчыя сходы беднякоў, але ўсёткі, ня гледзячы на гэты недахват, перавыбары праходзяць добра.

Пры выбарах, якія ўжо праведзены па 4-х вучастках, абрана сябрамі сельсавету 4 жанчыны, а летась у складзе сельсавету ні аднае жанчыны ня было.

На ўсіх сходах пры чытаньні наказу некаторыя сяляне зазначалі.

—Чыталі нам, кажа, і летась гэта, чытаюць і сёлета, але нашы дэпутаты у сельсавет ня выконваюць гэтага! Чаму гэта так?

Найбольш гаманіны было наконт разьмеркаваньня лесу, як мясцовага, так і дзяржаўнага значэньня і наконт зямлі. Былі, праўда, летась у нашым сельсавеце і такія выпадкі, што кулак атрымліваў 18 пнёў страявога дрэва і сажань дроў, а бедным бясконным і палена нават не давалося бачыць. За такую штуку сельсавет здорава бралі ў работу, а на выбарчым сходзе ў Яркове агульны сход даў наказ новым дэпутатам павесьці дасьледваньне па гэтай справе і вінаўных прыцягнуць да адказнасьці.

Крыўдуюць здорава і на тое, што сельсавет доўга пад сукном марынуе справы зямельныя. У некаторых мясцох, як у Дзехцяроўцы, напрыклад, сяляне школу хочуць будаваць на сваё сродкі, а райвыканком і сельсавет ня ішлі на спатканьне—таксама ўздымалася аб гэтым пытаньне. Новым дэпутатам выбаршчыкі сказалі, каб такіх больш недахватаў ня было.

—А калі будзеце круціць духамі, дык і вас да адказнасьці здолеем прыцягнуць.

Адмоўным пры перавыбарах зьяўляецца тое, што ня ў кожным выбарчым вучастку прысутнічае прадстаўнік ад РВК., напрыклад, у Яркоўскім перавыбарчым пункце на сходзе сяляне надта хацелі бачыць прадстаўніка РВК, а яго нідзе нельга было знайсьці.

М.

30 процантаў жанчын у савеце.

(Шацкі с.-с., Меншчына).

Дзякуючы добрай падрыхтоўчай працы перавыбары Шацкага с.-с. далі значна лепшыя вынікі ў параўнаньні з мінулым годам. Удзельнікаў на выбарчых сходах на 6 проц. больш, чым у мінулым.

Аб прысутнасьці жанчын і ўдзеле іх у перавыбарах сьведчыць лік прайдзенных жанчын у сябры с.-с. З 20 членаў сельсавету 6 жанчын.

З вясковых кабет у гэтым годзе члены сельсавету.

На перавыбарах балючымі пытаньнямі былі: дровы, лекавая дапамога, абсталяваньне школ і інш. І жанчына адналькова з мужчынам вырашыла іх.

— Чаму кадбор апалу далі як сьнег закрыў яго? Чаму к нашым урачам не падступіцца, бюракратамі сталі?

— Чаму школе ў пару апалу ня далі і іншае—пытаюць і выказваюцца на гэтых пытаньнях жанчыны.

Аўтарытэт партыі ўзрос: 1 сябра КПБ і 9 КСМ увайшлі ў склад новага сельсавету.

20 студзеня адбыўся першы пленум сельсавету. Да выбару прэзыдыуму аднесьліся ўважліва. Быўшаму сэкратару т. Дуброўскаму, якога „кучка“ хацела, далі атвод, як п'яніцы, які нават будучы п'яным згубіў казённыя грошы. І тут жанчыны не маўчалі.

— Я не магу працаваць у культкамісіі, ня ведаю іх абавязкаў, давайце кааперацыйную, або цабрабыту—заявіла адна кабета пры вылучэньні старшыні камісій пры сельсавеце.

Перавыбарамі засталіся ўсе задаволены. Скаргаў няма. Толькі на пленуме адзін сябра сельсавету застаўся незадаволены делегатамі на раёны зьезд. Яскрава відаць было, што сам жадаў папасьці.

Махавік.

Бедната гуртуецца наваколь партыі.

(Старобін, Случчына).

На ўсяму раёну былі праведзены сходы беднаты, на якіх бедната выявіла надзвычайную актыўнасьць. На перавыбарах таксама бедната з серадняκамі супольна падтрымлівалі кандыдатуры партыйцаў, камсамольцаў і беднякоў. Бедната цалкам дававала свае давер'е партыі. Сходы беднаты заўсёды перапаўняліся беднякамі-выбаршчыкамі. Перавыбарчыя сходы наведвала шмат жанчын-сялянак, якія таксама мала дзе адставалі ад мужчын у актыўнасьці. Галоўным дасягненьнем было тое, што ў склад сельсаветаў увайшлі партыйцы; болей усяго камсамольцы. Так, напр., у Чыжэвіцкім сельсавеце пры перавыбарах у сельсавет сялянства абрала 5-х камсамольцаў.

Бялько Ю. і Рыклін Г.

Вынікі перавыбараў.

«НАРЭШЦЕ САПСАВАЛІ».

(Чарневіцкі с.-с., Барысаўскага р.).

Перавыбары сельсавету закончыліся. Уся перавыбарная кампанія праходзіла досыць актыўна. На сходах прысутнічала 48-52 проц. выбаршчыкаў. Параўнаўча з мінулым годам процант прысутнасьці на выбарчых сходах павялічыўся. Гэта тлумачыцца прыбаўленьнем выбарчых вучасткаў.

Пры правядзеньні перавыбараў выявілася таксама і арганізаванасьць розных груп сялянства. Адразу было відаць, што кандыдатуры ў сельсавет ужо загадзя абмеркаваны і застаецца толькі галасаваць.

З адмоўных бакоў перавыбараў трэба адзначыць на наступнае: на ўсіх сходах зусім нязначны ўдзел прымалі жанчыны—усяго 5-10 проц. усіх прысутных. У гэтым, бязумоўна, вінны як мясцовыя арганізацыі, таксама і выбарчая камісія. У некаторых вёсках наглядаўся значны ўплыў заможнай часткі насельніцтва на бядняцкае дзеля чаго праходзілі пры «паднятых рук беднаты» «стаўленьнікі» заможнай часткі.

Усяго ў сельсавет абрана 11 членаў, у тым ліку толькі 1 жанчына.

У склад прэзыдыуму абраны ранейшыя старшыня і сэкратар. Насельніцтва гэтым незадаволена і ўжо на тэрыторыі сельсавету зьбіраюцца подпісы з хадайніцтвам аб перавыбары прэзыдыуму.

Вінавата ў гэтым выбарчая камісія і вось чаму. Пры вызначэньні часу першага арганізацыйнага пасяджэньня камісія вызначыла толькі дзень ня вызначыўшы пунктуальна «удзень» ці «увечары». З гэтай прычыны ня ўсе члены зьявіліся і выбіраць сталі толькі з фактычнага наяўча членаў, у той час, як грамадзкая думка была накіравана на другіх кандыдатаў, якія адсутнічалі і зьявіліся са спазненьнем.

Хто яго ведае, можа тут была і памылка, бо прыехаўшым за 30 вёрст членам камісіі ня было часу чакаць, пакуль усе члены зьбяруцца, а можа той, хто быў зацікаўлен справай і знарокам гэтак зрабіў. Усё можа быць, але няпрыемна чуць, што: ...«нарэшце сапсавалі».

Выбаршчык.

ВЫНІКІ ПЕРАВЫБАРАУ ЗАБАЛОЦКАГА СЕЛЬСАВЕТУ.

(Смалявіцкі р., Меншчына).

Забалоцкі с.-с. па эканамічнаму становішчу зьяўляецца большасьцю серадняцкім, а меншым проц. бядняцкіх гаспадарак і нязначным лікам кулацкага характару гаспадарак, якія ўжываюць наёмную працу з мэтаю эксплёатацыі.

Арганізацыйная і тэхнічная падрыхтоўка да перавыбараў з боку РК і РВК па ўсяму раёну была праведзена сваечасова, ніякіх адступленьняў ад канстытуцыі і інструкцыі аб перавыбарах дапушчана ня было. Сьпісы выбаршчыкаў, таксама сьпісы пазбаўленых выбарчых правоў, былі складзены сваечасова. Паведамленьне выбаршчыкаў (праз асобныя позвы) аб часе і месцы выбарчых сходаў, таксама праведзена сваечасова, дзен за 8—10.

Скаргаў аб пазбаўленьні выбарчых правоў па с. савету паступіла адна, якая ня была задаволена, паколькі зьявілася законнай сама пастанова аб пазбаўленьні. Усіх пазбаўленых выбарчых правоў па с. с.—21 асоб, з якіх 4 гаспадаркі, якія ўжываюць наёмную працу з мэтаю эксплёатацыі.

Летась пазбаўленых выбарчых правоў было толькі 4 асобы, да якіх адносіліся былыя паліцэйскія і г. д.

Па раёну праведзена 27 сходак беднаты, у сярэднім па 2-3 сходкі на с.-с.

На сходках беднаты таксама прымала серадняцтва. У выступленьнях і пытаньнях, пададзеных на сходках, выявіліся наступныя пытаньні, якія востра паўстаюць і выклікаюць часам нездавальненьне:

а) З боку беднаты: землеўпарадкаваньне, лесазабясьпечанасьць, крэдыт, с.-г. кааперацыя, льготы за культурнае травасеяньне.

б) З боку серадняκоў: аграномічная дапамога, арганізацыя злучных пунктаў, разьвядзеньне племяннoй жывёлы, разьвіцьцё садоўніцтва.

Агульныя пытаньні з боку ўсіх груп сялянства: пашырэньне сеткі школ, забясьпечаньне падручнікамі, аб апавышцы ў ЦК УсеКП(б), малае абслугоўваньне і наведваньне аддаленых вёсак з боку РВК, а толькі ў час перавыбараў, рашучая барацьба з злаадзействам і хуліганствам, слабыя меры караньня іх.

в) Кулацкая і заможная частка на прадвыбарчых сходах сябе не праявіла і нават не адчувалася.

Пры самых выбарах савету патрэбна адзначыць выяўленьне сьвядомасьці з боку выбаршчыкаў. Пры галасаваньні вызначылася асаблівая актыўнасьць і дружнае паводжаньне паміж беднатой і серадняκамі. Поруч са сьпісамі ячэйкі, якія праходзілі праз сходкі беднаты, на саміх сходах выстаўляліся кандыдатуры, лік якіх пераўвышаў 4-5 раз больш патрэбнага ліку выбіраемых. Гэтае сьведчыць аб тым, што прынцыпы дэмакратыі былі прыстасаваны і выяўлены цалкам на практыцы.

Выпадкаў адступленьня ад выбарчых норм, ніжэй 35 проц. зьявіўшыхся на сход, ня было. Таксама ня было выпадкаў, калі сходкі патрэбна было пераносіць з прычыны адсутнічаньня «кворуму».

Усяго выбаршчыкаў па с-с. 1.763, з іх мужчын 854 (48,5 проц.), жанчын—909 (51,5 проц.). Зьявілося на выбарчыя сходкі 773—43.26 проц.; мужчын 68 проц., жанчын 21,23 проц. У мінулым годзе зьявілася на выбарчыя сходы 717—(47,8 проц.).

Процант зьявіўшыхся на перавыбары ў параўнаньні з леташнім годам, ня толькі не павялічыўся, а наадварот, зьменшыўся на 4,54 проц. Прычыны гэтаму, на маю думку, асноўныя: а) слаба праведзеная падрыхтоўчая праца, зімовы час, вялікія маразы, мяцеліца, хутарская ў значнай меры раскіданасьць (Старына), малая ўмяшчальнасьць памяшканьня, укараніўшыся ня зьнішчаны традыцыйны погляд зьяўляцца на сход толькі прадстаўніку двара.

Некаторае павялічэньне зьявіўшыхся на сходы жанчын (з 20 проц. да 21,23 проц.) тлумачыцца тым, што перад выбарамі былі праведзены па некалькіх выбарчых вучастках (1-2) сходкі жанчын і наогул, сьвядомасьць жанчын значна ўзрасла за год.

Па асобных групах (бедныкі, батракі, серадняκі) удзел у перавыбарах апрадзяляецца наступным:

Усяго выбаршчыкаў	—	1763
З іх беднякоў	— —	661— 37 проц
„ батракоў	— —	8—0,45 „
„ серадняκоў	— —	1079— 57 „
„ рамесьнікаў	— —	7—0,40 „
„ настаўнікаў	— —	8—0,45 „
„ рабочых	— — —	26—1,45 „

Зьявілася на сходы:

Беднякоў	— — —	282— 43 проц.
Батракоў	— — —	7— 96 „
Серадняκоў	— — —	463— 43 „
Рамесьнікаў	— — —	
Настаўнікаў	— — —	8—100 „
Рабочых	— — —	17— 65 „
1. Канд. КПБ	— —	4—100 „
2. Чл. КСМ	— —	23—100 „

Як раней зазначана, колькасьць сходак беднаты нязначная. Але ня гледзячы на гэтае, бедната праявіла большую чым ў мінулым годзе актыўнасьць, таксама і батрацтва, ня толькі ў тым сэнсе, што ў параўнаньні з серадняκамі іх большы процант зьявілася на выбары, але ў тым, што на самых сходах у выступленьнях і пытаньнях, якія адбыліся асабліва па наказу, выявілася ўзрастая сьвядомасьць, асазнаньне сваіх клясавых інтарэсаў разам з рабочай клясай. пад кіраўніцтвам партыі. Арганізаванасьць беднаты таксама поўнасьцю выявілася пры выстаўленьні сваіх сьпісаў кандыдатаў у с.-с. і дружным галасаваньні за выстаўленых кандыдатаў на сходах беднаты, якія на 50 проц. былі праведзены ў склад с.-с. Значная частка серадняκоў трымалася разам з беднатой, галасавалі за кандыдатаў выстаўленых ад беднаты і толькі нязначная меншасьць серадняκоў устрымлівалася ары галасаваньні за сьпісы беднаты, выстаўлялі свае кандыдатуры.

Заможная частка на выбарах актыўнасьці асобай не праяўляла. Кулацкая частка фактычна была ізалявана пазбаўленьнем выбарчых правоў. Палітычнага ўплыву таксама не выяўляла, ні ў скрытай, ні ў адкрытай формах.

Як агульны вывад: кулацтва і заможная частка прымірылася, заціхла і прызнала сваю слабасьць і нядольнасьць паставіць сябе супроць бядняцка батрацка серадняцкага блёку.

Настаўніцтва ў выбарах, як сваім удзелам на сходах на ўсе сто проц. так і актыўным паводжаньнем на самых сходах, выяўляла свае добрыя адносіны да партыі і сумесна з беднатой і серадняκамі галасавала за сьпісы кандыдатаў, выстаўленых партячэйкай і беднатой.

Аўтарытэт настаўніцтва перад насельніцтвам значна ўзрос.

Другая група інтэлігенцыі (дактары аграномы) у перавыбарах не адчувалася, нічым сябе не праявіла. Мэдыцынскі склад, асабліва доктар, у час перавыбараў адчуваўся, але з адмоўнага боку. На некалькіх сходках сялянства выступала і выказвала нездавальненьне мэдычным уходам і прыёмам урача, указывала на няўважлівыя адносіны яго да пасяцыеля, кядбайныя адносіны ў час прыёму ў больніцы, спазьненьнем на заняткі і больш лепшыя адносіны ў час прыёму на даму, выказывалі думку аб замене ўрача (Ніналаевічы, Вада-Гара).

Наказ партыі з боку ўсіх груп сялянства сустрэў поўнае адабрэньне, асабліва з боку беднаты. Па наказу выяўляліся і задаваліся шэраг пытаньняў, маючых глыбокі палітычны сэнс, часткова адбіваючы настрой асобных груп сялянства, асабліва серадняцтва, каторае выказвала рэўнасьць ў адносінах беднаты ў сэнсе прадстаўленьня бедняцe льгот і дапамогі, а серадняκі як быццам, пазбаўлены дапамогі [illegible] льгот з боку партыі і савецкай ўлады.

Новы склад с.-с. абраны [illegible] 19 асоб, з іх: мужчын 18, жан[чын] 1, кандыдатаў партыі—3, чл[енаў] ЛКСМБ—3.

У мінулым годзе кандыдатаў партыі ня было, гэтае патрэбна вызначыць адным з асноўных дасягненьняў.

У складзе с.-с. служачых раней у Чырв. арміі—6 асоб. Абабраных у першы раз—7 асоб, па другому разу—9 асоб, і па 3-му разу—3.

Склад прэзыдыуму абабраны з [illegible] з іх 2 кандыдаты партыі (старшыня, сэкратар) і 1 беспартыйны (намеснік старшыні).

Кова[illegible]

Пастановы IV Сэсіі ЦВК БССР VII склікаьня.

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў Беларускае ССР (IV Сэсія)

ПА ДАКЛАДУ НАР. КАМІСАРА ЗАМЕЖНАГА І УНУТР. ГАНДЛЮ.

Заслухаўшы даклад Народнага Камісара Замежнага і Ўнутранага Гандлю і прымаючы пад увагу, што ў сувязку з уростам таварнасьці сельскае гаспадаркі і пашырэньнем прадукцыі дзяржаўнае прамысловасьці, пытаньні планавага рэгуляваньня тавараабароту і правільных суадносін цэн набываюць асаблівае значэньне не толькі ў разьвіцьці прамысловасьці і сельскае гаспадаркі, але і ва ўзаемаадносінах паміж горадам і вёскаю,—IV Сэсія Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР пастаўляе:

1. Ухваляючы ўрадавыя мерапрыёмствы па зьніжэньні розьнічных цэн і адзначаючы станоўчыя дасягненьні у гэтым напрамку, меўшыя вынікам павялічэньне рэальнае заработнае платы рабочых і пакупное здольнасьці сялянства, забесьпячэньне цьвёрдасьці чырвонцу і гэтым самым прысьпешаньне тэмпу разьвіцьця народнае гаспадаркі краіны ў вагуле IV Сэсія ЦВК лічыць, аднак, дасягнутыя вынікі нявыстарчальнымі і прызнае неабходным рашуча праводзіць далейшыя мерапрыёмствы ў справе зьніжэньня цэн, асабліва розьнічных, шляхам:

а) максымальнага патаненьня каштоўнасьці гандлёвага пасрэдніцтва, шляхам рашучага скарачэньня апарату, гандлёва-накладных выдаткаў і праводжаньня строжайшага рэжыму эканоміі, узмацнеьня барацьбы з безгаспадарнасьцю, растратамі, расьцягваньнямі і біракратызмам у гандлёвых апаратах дзяржаўных і кааперацыйных арганізацый;

б) скарачэньня шляхаў праходжаньня тавараў ад фабрыкі да спажыўца, шляхам працягненьня работы па рацыяналізацыі тавараправоднае сеткі, узмацненьня транзітнага завозу па лініі кааперацыі беспасрэдна ад фабрыкі да райсаюзаў, з масавых тавараў (соль, цукар і г. д.) да буйных спажывецкіх таварыстваў, гэтак і прыняцьце далейшых захадаў да зьнішчэньня маючых яшчэ месца сустрэчных перавозак;

в) поўнага праводжаньня ў жыцьцё ўсімі дзяржаўнымі і кааперацыйнымі гандлёвымі арганізацыямі ўстанаўліваемых НК Замежнага і Унутранага Гандлю гранічных надбавак, не дапушчаючы парушэньня іх;

г) прыняцьце захадаў да далейшага зьніжэньня сабекошту прадукцыі прамысловасьці, што паслужыць асноваю да зьніжэньня оптова-адпускных цэн, якія ў сваю чаргу павінны выклікаць адпаведнае зьніжэньне цэн розьнічных.

2. IV сэсія ЦВК, прыдаючы вялікае палітычнае і эканамічнае значэньне прыцягненьню шырокіх мас рабочых і сялян у справу зьніжэньня розьнічных цэн і гандлёва-накладных выдаткаў, лічыць неабходным узмацненьне грамадзкага кантролю ў гэтай галіне шляхам ажыўленьня дзейнасьці крамных і рэвізійных камісій кааперацыі, нізавых ячэек прафэсыянальных саюзаў, інстытуту дэлегатак, а таксама прыцягненьня да больш актыўнага ўдзелу ў рабоце па зьніжэньню розьнічных цэн савецкіх органаў; гарадзкіх саветаў і іх сэкцый, раённых выканаўчых камітэтаў і сельскіх саветаў.

Адначасна IV сэсія ЦВК лічыць, што работа па зьніжэньні цэн павінна быць разьлічана на працяжны перыяд часу, насіць планавы сыстэматычны характар і павінна стаць у асяродку увагі як цэнтральных, гэтак і мясцовых органаў.

3. Канстатуючы павялічэньне планавага завозу асноўных прамысловых тавараў і ў сувязку з гэтым—некаторае паслабленьне таварнага голаду,—IУ сэсія ЦВК, разам з тым, адзначае, што попыт на большасьць сэзонных тавараў застаецца ў значнай меры незадаволеным, што тлумачыцца неадпаведнасьцю вытвараемага прамысловасьцю асартыменту сэзонным запатрабаваньням, дзеля чаго неабходна дапасаваць асартымент прамысловае прадукцыі да запатрабаваньняў рынку і палепшыць якасьць яго.

НКГандлю разам з дзяржаўнымі і кааперацыйнымі арганізацыямі ў мэ[illegible] поўнага задавальненьня [illegible] лічыць завоз невыстарчальным [illegible]аў і аддаць больш увагі [illegible]ньню прадукцыі сама[illegible]овасьці.

[illegible] пад увагу асаблівыя ўмо[illegible]ннае паласы, перашкаджа[illegible]даму разьвіцьцю тавара[illegible] сэсія ЦВК ухваляе мера[illegible] па павялічаным задаваль[illegible]агранічных раёнаў тавара[illegible] кааперацыйную сыстэму і лі[illegible] неабходным у далейшым гэтыя [illegible]ёмствы прадоўжываць.

[illegible]дзначаючы шэраг дасягненьняў [illegible]мацненьні удзельнае вагі ў та[illegible]вароце БССР дзяржаўнага і асабліва кааперацыйнага гандлю, за лік выціханьня прыватнага капіталу, IV сэсія ЦВК лічыць неабходным далейшае разьвіцьцё дасягнутае пераважнасьці дзяржаўнага і кааперацыйнага сэктару гандлю, шляхам якаснага палепшаньня яго работы, патаненьня апарату, дапасаваньня гандлёвае дзейнасьці і падбору тавараў да найлепшага абслугоўваньня шырокіх мас спажыўцоў, якім павінны быць на самай справе даказаны яго перавагі перад прыватным гандлем.

Разам з тым, IV сэсія ЦВК лічыць неабходным і далей, каб гандлёвая дзейнасьць прыватніка падлягала больш поўнаму падліку і ўсебаковаму кантролю, у мэтах дзяржаўнага рэгуляваньня.

5. У мэтах узмацненьня і рацыяналізацыі тавараправоднае сеткі IV сэсія ЦВК лічыць неабходным:

а) пашырэньне кааперыраваньня насяленьня, узмацненьня фінансавага становішча кааперацыі за лік далейшага прыцягненьня паявых капіталаў і ўкладаў з боку насяленьня, вызваленьне для звароту сродкаў з нехадавых тавараў і няліквідных каштоўнасьцяй;

б) зьвярнуць увагу на кааперыраваньне сельскае беднаты, для чаго павялічыць спецыяльныя фонды за лік адлічэньняў ад прыбытку кааперацыі і сродкаў камітэтаў узаемадапамогі, дапамагаючы беднаце такім шляхам уваходзіць у кааперацыю і імкнуцца пры гэтым да павышэньня актыўнасьці і гаспадарчае самадзейнасьці сялянскае беднаты ў кааперацыйным будаўніцтве.

6. Сэсія ЦВК лічыць своечасовым пастаноўку пытаньня аб пашырэньні кааперацыйных саюзаў за лік эканамічна-неапраўдываючых свайго самастойнага існаваньня. Адначасова неабходна зрабіць захады да пашырэньня сеткі кааперацыйных крам з тым, каб работаю кааперацыі былі ахоплены ў першую чаргу ўсе прамысловыя раёны і фабрычна-заводзкія прадпрыёмствы.

7. У мэтах больш поўнага ахопу кааперацыяй рабочага бюджэту, IУ-ая сэсія ЦВК лічыць неабходным узмацненьне дзейнасьці цэнтральных рабочых кааператываў у галіне задавальненьня запатрабаваньняў рабочага насяленьня адпаведным дапасаваньнем асартыменту тавараў, пашырэньнем гандлю сельска-гаспадарчымі прадуктамі і прадметамі хатняга абіходу, пашырэньнем хлебапячэньня і мяснога гандлю.

8. IV сэсія ЦВК адзначае, што да сучаснага моманту дзяржаўнымі і кааперацыйнымі гандлёвымі арганізацыямі не звярачвалася патрэбнае ўвагі кірмашнаму і базарнаму гандлю, іграючаму значную ролю ў справе тавараабароту паміж прамысловасьцю і сельскаю гаспадаркаю, у сувязку з ростам таварнасьці апошняе, дзеля чаго на кірмашны гандаль павінна быць у далейшым зьвернута асаблівая ўвага больш шырокім яе абслугоўваньнем.

9. Выходзячы з спажываючага характару БССР у адносінах хлебных культур, паніжанага ўраджаю і абумоўленага гэтым дэфіцытнага хлебафуражнага балянсу на 1926-27 г. (дэфіцыт 14 мілн. пуд) асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на своечасовы завоз хлеба з вытворчых раёнаў праз дзяржаўныя і кааперацыйныя арганізацыі, у мэтах задаволеньня насяленьня і ўтрыманьня цэн на прыемлімым узроўні.

10. Адзначаючы нераважнае значэньне жывёлагадоўлі і тэхнічных культур у сельскай гаспадарцы БССР (у 1925-26 годзе сялянская гаспадарка выкінула на рынак розных жывёлагадоўчых прадуктаў на суму каля 54 мілн. руб., валакна і масланасеньня на суму каля 9,3 міл. руб., у той час, як зерневых толькі на суму каля 4,3 мілн. руб.), сэсія ЦВК лічыць неабходным у мэтах далейшага пашырэньня таварнасьці гэтых галін сельскай гаспадаркі і для пашырэньня сыравіннае базы прамысловасьці і экспорту, зьвярнуць большую ўвагу на загатоўку і збыт дзяржаўнымі і кааперацыйнымі арганізацыямі мяса, малочных і інш. прадуктаў жывёлагадоўлі, тэхнічных культур і садавіны і г. д.

Ухваляючы ўрадавыя мерапрыёмствы па ўзмацненьні масагандлюючых арганізацый (Белмасгандаль), IV сэсія ЦВК лічыць неабходным і наперад весьці работу ў гэтым напрамку.

Адначасна IV сэсія ЦВК даручае СНК зрабіць захады да пашырэньня разьвядзеньня і палепшаньня пароды быдла, сьвіней і хатніх птушак, а так сама праводзеньня агракультурных мерапрыёмстваў, дапамагаючых пашырэньню засеваў і палепшаньня якасьці лёну і пянькі.

Палітыка цэн на ўсе тыпы сыравіны павінна быць накіравана на стымуляваньне далейшага разьвіцьця рэсурсаў сыравіны, у адпаведнасьці з інтарэсамі прамысловасьці і экспорту, а таксама заахвочваць і дапамагаць палепшаньню якасьці прадукцыі сыравіны з боку сялянства.

Прымаючы пад ўвагу, што збыт с.-г. прадукцыі ня можа атрымаць належнага разьвіцьця без наліччя сеткі прадпрыёмстваў для перапрацоўкі мяса (беконныя, кансэрвовыя і каўбасныя ф-кі, бойні), малака, садавіны і інш. прадуктаў, а таксама халадзільнікаў і пунктаў па першапачатковай апрацоўцы лёну і інш., IV сэсія ЦВК даручае СНК распрацаваць адпаведныя мерапрыёмствы ў бок пашырэньня іх, з уцягненьнем для гэтага сродкаў як дзяржаўных, так і самога насяленьня, праз кааперацыйныя арганізацыі.

II, У інтарэсах узмацненьня сацыялістычных элемэнтаў на вёсцы, павышэньня таварнасьці сельскае гаспадаркі, яе інтэнсыфікацыі і найбольш выгоднае для вытворпа арганізацыі збыту яго прадукцыі, IV сэсія ЦВК лічыць мэтазгодным узмацненьне разьвіцьця спецыяльных галін вытворча-збытавых сельска-гаспадарчых кааператываў (малочных, птушніцкіх, жывёлагадоўчых, гародніх і г. д).

12. У галіне замежнага гандлю неабходна імкнуцца да далейшага ўмацненьня манаполіі замежнага гандлю і захаваньня актыўнасьці гандлёвага балянсу.

Асноўнымі задачамі павінны быць пашырэньне нашага экспорту за лік, галоўным чынам, прадуктаў жывёлагадоўлі і птушніцтва, уцягненьня новых галін другараднага характару, а таксама разьвіцьця вывазу прамысловага вытвору (лесаматар'ялы, сернікі, шкло, смалапрадукты); падвышэньне якаснага боку экспорту, дасягненьня яго бязубытачнасьці, скарачэньня гандлёвых і накладных выдаткаў, а таксама ўзмацненьня фінансавае базы экспорту.

Кааперацыйныя сыстэмы павінны быць у большай меры прыцягнуты да загатоўкі экспортнае сыравіны.

Увоз тавараў за мяжы (імпорт) павінен знаходзіцца ў простай адпаведнасьці з вытворчымі праграмамі прамысловасьці, плянамі сельскае гаспадаркі і культурнага будаўніцтва.

Разам з тым IV сэсія ЦВК лічыць неабходным павялічыць цяперашні выраб і паставіць адпаведна рэсурсам сыравіны БССР новую вытворчасьць тавараў, складаючых прадмет імпорту (саламарэзкі, пружынныя бароны, цэлюлёза, каніфоль і г. д.).

У мэтах узмацненьня і разьвіцьця дзяржаўна-кааперацыйнага гандлю і больш пасьпяховага выціханьня прыватнікаў, IV сэсія ЦВК лічыць неабходным узмацненьне плянавасьці і гібкасьці ў агульнай рабоце па рэгуляваньні гандлю.

Адначасна ў мэтах аздараўленьня і ўдасканаленьня кааперацыйнага апарату сэсія лічыць патрэбным павысіць культурны ўзровень кааперацыйных работнікаў, шляхам адпаведнае іх падрыхтоўкі.

Старшыня ЦВК БССР А. ЧАРВЯКОЎ.
Сэкратар ЦВК БССР З. ЧАРНУШЭВІЧ.
28 студзеня 1927 г.
г. Менск.

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае Савецкае Сацыялістычнае Рэспублікі VII скліканьня (IV сэсія).

АБ ЗЬМЕНАХ У СКЛАДЗЕ ЎРАДУ.

Цэнтральны Вык. Камітэт Беларускае Савецкае Сацыялістычнае Рэспублікі пастанаўляе пацьвердзіць наступныя зьмены ў складзе Савету Народных Камісараў:

а) вызваліць ад выпаўненьня абавязкаў Народнага Камісара Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі БССР тав. Радус-Зеньковіча і назначыць Народным Камісарам Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі БССР тав. Ка[illegible]іна, вызваліўшы яго ад выпаўненьня абавязкаў старшыні Вышэйшага СНГ БССР;

б) на пасаду старшыні Вышэйшага Савету Народнай Гаспадаркі назначыць т. Карпа С. В. без вызваленьня яго ад абавязкаў намесьніка старшыні Савету Народных Камісараў БССР;

в) вызваліць ад выпаўненьня абавязкаў Народнага Камісара Працы БССР т. Юрафеева С. С. і назначыць Народным Камісарам Працы БССР тав. Славінскага А. С.

Старшыня ЦВК БССР А. ЧАРВЯКОЎ
Сэкратар ЦВК БССР З. ЧАРНУШЭВІЧ.

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае Савецкае Сацыялістычнае Рэспублікі VII скліканьня (IУ сэсія).

ПА ДАКЛАДУ ЦЭНТРАЛЬНАЙ СТАТЫСТЫЧНАЙ УПРАВЫ АБ ДЭМАГРАФІЧНЫМ ПЕРАПІСЕ.

Заслухаўшы даклад т. Шкубера аб дэмаграфічным перапісе па Беларусі, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт (IУ Сэсія) пастанаўляе прыняць даклад да ведама.

Паколькі дэмаграфічны перапіс мае вялікае значэньне ў будаўніцтве Савецкае Беларусі Цэнтральны Выканаўчы Камітэт лічыць неабходным паскорыць распрацоўку атрыманых у выніку перапісу матар'ялаў.

Надаючы пытаньням статыстыкі, а разам з гэтым і працы статыстычных органаў Беларусі вялікае значэньне, Цэнтральны Выканаўчы камітэт БССР пастанаўляе выслухаць на адной з чарговых сэсій агульны даклад аб задачах і дзейнасьці Цэнтральнае Статыстычнае Управы БССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. ЧАРВЯКОЎ.
Сэкратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР З. ЧАРНУШЭВІЧ.

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР VII скліканьня

АБ ПАЦЬВЯРДЖЭНЬНІ ЗАКОНАЎ, ПРЫНЯТЫХ У ЧАС[illegible] МІЖ III-Й і IУ-Й СЭСІЯМІ ЦВК БССР VII СКЛІКАНЬНЯ.

IУ сэсія Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БСС УII-га скліканьня пастанаўляе:

Зацьвердзіць ніжэйпаданыя пастановы Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісраў БССР, прынятыя ў перыяд паміж III-й і IУ-й сэсіяй ЦВК УII-га скліканьня.

1. Пастанову ад 7-га жніўня 1926 г. аб зацьверджаньні Палажэньня аб службе Рабоча-Сялянскай Міліцыі БССР (Зб. Зак 1926 г. № 35, арт. 129).
2. Пастанову ад 4-га верасьня 1926 г. аб дапаўненьні арт. 60 зямельнага кодэксу ўвагаю (Збор. Зак. 1926 году № 40, арт. 150).
3. Пастанову ад 18 верасьня 1926 г. аб мове, на якой павінны складацца дакументы, што выдаюцца ўстановамі БССР і прызначаны для прад'яўленьня і карыстаньня ў іншых Рэспубліках ССCР (Зб. Зак. 1926 г. № 40 арт. 148).
4. Пастанову ад 18-га верасьня 1926 г. аб мерапрыёмствах па шляхаваму будаўніцтву сельскага значэньня (Зб. Зак. 1926 г. № 39 арт. 141).
5. Пастанову ад 18-га верасьня 1926 г. аб дапаўненьні ўвагаю арт.34 і аб зьмене ўвагі да арт. 35 Крымінальнага Кодэксу (Зб. Зак. 1926 г. № 40, арт. 146).
6. Пастанову ад 18-га верасьня 1926 г. аб дапаўненьні Грамадзянскага Працэсуальнага Кодэксу разьдзелам 27-а (Зб. Зак. 1926 г. № 39, арт. 143).
7. Пастанову ад 18 верасьня 1926 г. аб дапаўненьні Грамадзянскага Працэсуальнага Кодэксу арт. 203-а-в (Зб. Зак. 1926 г, № 40, арт. 144).
8. Пастанову ад 18 верасьня 1926 г. аб зьмене арт. 254 Грамадзянскага Працэсуальнага Кодэксу і аб дапаўненьні апошняга арт. арт. 254-а і 254-б (Зб. Зак. 1926 г. № 40, арт. 145).
9. Пастанову ад 16 кастрычніка 1926 г аб зьмене арт. 79 Крымінальнага Кодэксу (Зб. Зак. 1926 г. № 43, арт. 163).
10. Пастанову ад 6-га лістапада 1926 г. аб зьмене арт. 1-га пастановы ЦВК і СНК Беларускай ССР ад 29 мая 1926 г. аб пазбаўленьні народных судоў ад разгляду некаторых катэгорый спраў, якія разглядаюцца ў парадку грамадзянскага судаводства (Зб. Зак. 1926 г. № 46, арт. 174).
11. Пастанову ад 13-га лістапада аб зьмене арт. 176 Крымінальнага Кодэксу (Зб. Зак. 1926 г. № 46, арт 172).
12. Пастанову ад 8-га сьнежня 1926 г. аб далучэньні да БССР Рэчыцкага і Гомельскага паветаў са складу быўш. Гомельскай губэрні РСФСР („Сав. Бел." за 9-га сьнежня 1926 г. № 280-1875).
13. Пастанову ад 8-га сьнежня 1926 г. аб арганізацыі кіраваньня далучаных да БССР Рэчыцкага і Гомельскага паветаў («Савецкая Беларусь» ад 9-га сьнежня № 280-1875).
14. Пастанову ад 18-га студзеня 1927 г. (прат. Прэзыдыуму ЦВК БССР № 76, п. 1075) аб зьмене арт. 2 Палажэньня аб раённых зьездах саветаў і іх выканаўчых камітэтаў (Зб. Зак. БССР № 31, арт. 290).
15. Пастанову ад 26-га студзеня 1927 г. аб зьмене ўвагі да арт. 22 Грамадзянскага Кодэксу і аб прызнаньні страціўшай сілу пастанову ЦВК і СНК БССР ад 31-га студзеня 1925 г. «об отчуждении некоторых категорий государственного имущества».
16. Пастанову ад 26-га студзеня 1927 г. аб дапаўненьні арт. 73 Грамадзянскага Кодэксу 3-й увагай.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. ЧАРВЯКОЎ.
Сэкратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР З, ЧАРНУШЭВІЧ.
28 студзеня 1927 г.
г. Менск.

Зацьверджаньне водна-меліярацыйнага кодэксу.

Сэсія ЦВК прыняла ў аснову праэкт водна-меліярацыйнага кодэксу БССР. Прэзыдыуму ЦВК даручана канчаткова зрэдагаваць яго, пагадзіўшы з заканадаўствам іншых саюзных рэспублік.

Цэнтральнаму Выканаўчаму Камітэту БССР.

(Атрымана на мове эсперанта).

Лейпцы, 15 студзеня 1927 г.

Паважаныя таварышы!

Даведаўшыся аб вашай сэсіі, мы вітаем крокі па аб'яднаньню Беларусі. Рэвалюцыйны пралетарыят нашай старонкі з вялікім інтарэсам сачыць за ўсімі вашымі посьпехамі. Няхай ваша цяперашняя сэсія дасьць нашым пралетарыям таўчок да ўсьвядомленьня сваіх абавязкаў, якія заключаюцца па ўстанаўленьні адзінага фронту, здольнага канчаткова перамагчы сусьветны капіталізм. Па даручэньні „Пралетарскай—эсперанскай службы заходняга Саксонскага Саюзу Чырвоных франтавікоў" і „Саюзу рабочых эсперантыстаў нямецкай краіны", жадаем вашай сэсіі самых плодатворных дасягненьняў.

Няхай жывуць нашыя савецкія браты па клясавай барацьбе!
Няхай жыве сусьветны адзіны пралетарскі фронт!
Няхай жыве сусьветная рэвалюцыя і канчатковая перамога сусьветнага пралетарыяту!

ОТТО БЭСЬЛЕР.

Не зайдрошчу жыцьцю рабочага.

(Гутарка з сялянкай Гомельскай акругі т. Багамолавай)

У нас у вёсцы часта гутараць, што рабочаму жывецца шмат лепш, чымся селяніну, што рабочы нібы мала працуе, добра апранаецца і смачна есьць. У часе сэсіі ЦВК мне давялося пабываць у некаторых фабрычных прадпрыёмствах Менску.

Тав. Багамолова.

На заводзе „Энэргія" я ўбачыла, што рабочыя апрануты ў запэцканае брудное адзеньне; рукі і твар рабочых зап[illegible] у памяшканьні, дзе знаходзяцца машыны, страшэнны тлум і нейкая смуга.

Калі пачалі ліць ў формы расплаўленае чырвонае жалеза я чуць не самлела.

Калі-ж мы падышлі да заводу, дзе вырабляюць скуры, я ледзь не задыхнулася ад смуроду. Вось тут я пераканалася, што гэта хлусьня, што рабочаму жывецца лепш, чым селяніну; селянін працуе на вольным паветры, калі захоча—тады адпачне, а рабочаму штодня прыходзіцца працаваць у цяжкіх абставінах.

Была ў Беларускім Дзяржаўным тэатры; асабліва я ўпадабала п'есу „Кар'ера таварыша Брызгаліна". Вось гэта тэатр, ды паставіць у нашым Дзятлаве (вёска), вось бы гэта п'еса паказала-б нашаму сялянству, як [illegible] у савецкія ўстановы розныя авантурнікі і расколы, а потым зьдзекваюцца над народам.

Апроч таго, мова, на якой гавораць на сцэне, вельмі для мяне зразумелая, ну, якраз-жа, як у нашай вёсцы.

Таксама я ўпадабала, што на сэсіі гавораць пабеларуску, проста, як у вёсцы гавораць мужчыны і дзеці.

Але вось, што я заўважыла дрэннае ў Менску—гэта шмат беспрытульных дзяцей. Трэба зьвярнуць на гэта ўвагу каб павесьці рашучую барацьбу з гэтым [illegible]

Рабочае і прафэсыянальнае жыцьце.

Да акруговых канфэрэнцый спэцыялістых сельскай і лясной гаспадаркі.

Пачынаючы з канца студзеня месяца па пляну ЦП саюзу сельгасрабочых будуць праводзіцца акруговыя канфэрэнцыі спэцыялістых сельскай і лясной гаспадаркі. Галоўнымі пытаньнямі канфэрэнцыі павінны быць азнаямленьне з вынікамі існаваньня і практычнай працы сэкцыі (даклад ЦБ), справаздачы бюро сэкцый, выбары бюро сэкцый, выбары бюро і шэраг пытаньняў непасрэднай працы спэцыялістых. Двухгадовае існаваньне сэкцый у саюзе сельгаслесрабочых, арганізаваных для лепшай арганізацыі спэцыялістых у саюзе, лепшага абслугоўваньня іх і ўцягненьня ў практычную савец[...] прафэсыянальную і грамадзкую [...] дае шэраг станоўчых вынікаў. [...] прафэсыянальны актыў,—у выбарных сэкцыённых органах працуе зараз больш пацідзесяці сяброў сэкцыі—каля гэтага ж ліку працуе на выбарных пасадах у прафэсыянальных органах, дапамагаючы выконваць адказную ролю саюзу на вёсцы. Праца ў вытворчых нарадах у саўхозах праходзіць пры непасрэдным актыўным удзеле сяброў сэкцыі. Вось лічбы, якія характэрызуюць удзел грамадзкай аграноміі ў працы грамадзкіх органаў—с.-г. кааперацыі:

На 1-га кастрычніка ў складзе праўленьняў было 121 аграномаў, што складае 36 проц. ад агульнага ліку аграработнікаў раёнаў. Гэтым, бязумоўна, не абмяжоўваецца грамадзкая і савецкая праца спэцыялістых на вёсцы.

Матар'яльна-бытавое становішча зараз аграработнікаў не дае яшчэ магчымасьці максымальна-вытворча скарыстоўваць сваю працу, але і ў апошнюю бюджэтную кампанію партыя і ўлада прыняла некаторыя мерапрыёмствы да палепшаньня становішча спэцыялістых. Аднак павышэньне зарплаты раённым працоўнікам і дасьледчыкам, пачатак пляновага будаўніцтва аграпунктаў, забесьпячэньне сродкамі на курсы па павышэньню кваліфікацыі аграработнікаў і інш., ніяк не могуць згладзіць тых недахопаў, якія маюцца ў жыцьці аграработнікаў, якія зусім стала ўстаноўлены і рэвізійнай камісіяй НКЗБ. Забясьпечаньне кватэрамі ледзь дасягае 50 проц. Натуральнае забясьпячэньне сродкамі перасоўкі прадстаўляецца ў наступным відзе: раёнаў с 1 канём 57 проц., з 2-ма 26 проц. і бяз коняў 7 проц., к якому ліку дадаткова асыгнаваны грашовыя срадкі па акругам на аграработніка ў год: Менскі—17 руб., Полацкі—82 руб., Мазырскі—100 руб., Віцебскі—9 р. Калінінскі—120 руб., Слуцкі—70 руб., Магілеўскі—50 руб., што, бязумоўна, у ткім выглядзе ні ў якім разе ня вырашае пытаньня аб перасоўках і інш.

Усебеларуская канфэрэнцыя, скончыўшая сваю працу ў лістападзе месяцы, прыняла праграму максымум на бліжэйшыя гады сэкцыйнага будаўніцтва ў ва ўсіх галінах. Праца акруговых канфэрэнцый павінна iсьці па шляху практычнага праламленьня гэтых рашэньняў у акруговым маштабе.

Пытаньні арганізацыйнага парадку складаецца ў галоўным з неабходнасьці выбараў працаздольных бюро, ахопліваючых галоўныя катэгорыі сяброў сэкцыі,—улік папярэдняй працы, далейшае выхоўваньне прафактыву шляхам уцягненьня ў практычную працу праз сэктары, перыядычныя камісіі і разгортваньне масавай працы сярод усіх катэгорый спэцыялістых. Трэба ў гэтым напрамку і большая дапамога саюзных органаў працы сэкцый. Адказная роля саюзу Сельгаслесрабочых на вёсцы настойліва патрабуе пашырэньня працы сярод сяброў саюзу па 2-х галоўных арганізацыйных формах: праца ў вытворчых нарадах, культасьветных установах і агульных сходах—канфэрэнцыях у напрамку павышэньня вытворчай кваліфікацыі рабочых.

Перад акруговымі канфэрэнцыямі ў ва ўсю шыр павінна ўстаць пытаньне аб працы па павышэньню кваліфікацыі спэцыялістых. Гэта выклікаецца і ўскладненьнем форм гаспадарчага будаўніцтва і значна выраслай актыўнасьцю насельніцтва і тым «размагнічваньнем», якое знаходзіць спэцыяліст на раёне дрэнна абарудаваны спэцыяльнымі падручнікамі, перагружаны і г. д. Патрэбна, папершае, праверыць правільнасьць тых форм і шляхаў, якія выразна вызначаны ўсебеларускай канфэрэнцыяй, каб гэтым самым даць падставу для іх практычнага выконваньня і, падругое, патрэбна ажывіць на падставе іх практычную працу мясцовых магчымасьцяў. Навукова-грамадзкая праца, шляхам дакладаў, дыспутаў, кампляктаваньне бібліатэк, пашырэньне падпіскі на розныя часопісі, экскурсіі ў напрамку павышэньня палітычнай і грамадзка-вытворчай кваліфікацыі павінны быць разгорнуты зараз-жа. Трэба яшчэ раз на акруговых канфэрэнцыях паставіць практычныя пытаньні аб неабходнасьці больш рашучага праводзеньня ліквідацыі беларускай няпісьменнасьці і наогул сапраўднага выконваньня нацпалітыкі, як моцнага фактара адбудовы гаспадаркі і культуры.

Т. Аўчыньнікаў.

Чаму цэлы год маўчалі.

(Горкі).

На днях адбыліся перавыбары бюро сэкцыі навуковых працаўнікоў Беларускай Дзяржаўнай с.-г. Акадэміі.

Па справаздачнаму дакладу старшыні бюро выявілася актыўная дзелавая крытыка працы бюро за мінулы год, у якой было адзначана цэлы шэраг недахопаў, галоўныя з якіх былі вызначаны і ў пратаколе рэвізійнай камісіі.

Асабліва была вызначана вельмі слабая абарона прафэсыянальных інтарэсаў сяброў сэкцыі, амаль што поўнае ігнараваньне пастаноў ня толькі бюро, а нават і агульных сходаў сэкцыі праўленьнем Акадэміі, дзякуючы чаму сэкцыя пачала губляць аўтарытэт сярод навуковых працаўнікоў, як прафэсыянальная арганізацыя.

Гэтак-жа сэкцыяй зусім ня была звернута ўвага на становішча навуковых супрацоўнікаў і абарону іх інтарэсаў; зусім бяз увагі застаўся факт зьніжэньня асыстэнтам заробкавай платы ў гэтым годзе ў параўнаньні з мінулым, дзякуючы чаму цэлы шэраг асыстэнтаў прымушаны былі пакінуць працу ў Акадэміі. І толькі у апошнія часы гэтае пытаньне было пастаўлена на абгавор бюро.

Больш здавальняюча вялася культурна-асьветная праца, здавальняюча працавала сталоўка пры сэкцыі Нав. Прац.

Цікава, што старшыня бюро ў заключным слове выказаў на поўную адсутнасьць, па яго погляду, пэрспэктыў працы сэкцыі, як прафэсыянальнай арганізацыі, па прычыне, што Акадэмія на дзяржбюджэце, а ня прыватнае прадпрыёмства.

Перавыбары прайшлі з значнай актыўнасьцю. Упяршыню ў практыцы перавыбару бюро сэкцыі сход навуковых працаўнікоў выказаў большую сацыяльную сьмеласьць адкінуўшы інтэлігэнцкае звычайнае галасаваньне, правёўшы перавыбары адкрытым галасаваньнем.

На перавыбарах прысутнічалі прадстаўнікі ЦБ сэкцыі навуковых працаўнікоў Беларусі—старшыня ЦБ праф. Вальфсон і сакратар ЦБ Друшчыц, якімі былі зроблены два даклады на сходзе.

Я. С.

Праца сярод батрацтва і лесарубаў.

(Слуцак).

Усяго саюзам аб'яднана батракоў і пастухоў па акрузе 1749 чалавек. У параўнаньні з мінулым годом лік павялічыўся на 248 чалавек. Дзякуючы таму, што батрацтва камплектуецца з мясцовага жыхарства і толькі каля 25 проц. ня маюць зямлі, справа па ўцягненьню ў сябры саюзу праходзіць цяжкавата. З усяго ліку батракоў толькі 284 чал. зьяўляюцца сябрамі саюзу. Найболей зацікаўлены саюзам батракі, якія ня маюць свае[й] уласнасьці.

Усё батрацтва і пастуства ў ліку 1729 чал. ахоплена працоўнымі ўмовамі, пры чым найболей умовы заключаюцца ад 3 да 9 месяцаў, а гадавых толькі ёсьць 521 умова.

Зарплата ў гэтым годзе павялічылася, і батракі палучаюць ад 2 да 15 р., звыш 15 р. палучаюць толькі 12 чал.

Заключэньне ўмоў з кожным годам палепшаецца, і батрацтва зразумела ўсю карысьць для сябе заключэньня ўмоў і само нават заключае іх. У гэтым годзе амаль усё батрацтва ахоплена ўмовамі. Горш справа абстаіць з пастухамі, бо большай часткай гэта недалеткі, бацькі якіх сяляне і лічаць непатрэбным заключэньне ўмоў, а падругое, прыходзіцца мець справу з грамадой, в якой цяжэй згаварыцца, чымся з адным чалавекам.

Ня гледзячы на ўсе цяжкасьці, у гэтым годзе ахоплены дагаворамі значна большы лік пастухоў, чымся летась. Недахопам у дагаворнай кампаніі зьяўляецца тое, што сельсаветы прымаюць нязначны ўдзел у ёй і саюзу самому прыходзіцца весьці працу па выяўленьню батрацтва і заключэньню ўмоў з наймацелямі.

Парушэньняў дагавораў у гэтым годзе значна менш, чымсі летась, бо наймацелі прывыклі іх выконваць і ведаюць, што саюз усёроўна прымусіць іх выканаць.

Вялікіх лесапрапрацовак у акрузе няма і на іх большай часткай працуе мясцовае сялянства. Дзякуючы гэтаму, уцягнута ў саюз толькі 10 чалавек лесарубаў. Усю прафэсыйную працу вядуць сярод іх рабочкомы лясьніцтва.

К—ч.

Утопімся ў паперах.

(Дрын, Аршаншчына).

Усім досыць зразумела непатрэбнасьць тых справаздач на сотнях аркушаў з сотнямі форм і тысячамі запытаньняў, тых анкет аб «моржах і цюленях», якім закідваюцца нашы нізавыя савецкія ўстановы.

Калі такі невялікі раён, як Дрыбінскі, запісаў у свой настольны рэестр на працягу 1926 году больш 11 тысяч паступленьняў рознага характару папер, сьпісаў на гэтую запісь 6 журналаў па 200 лістоў; калі спэцыяльна пасаджаны на гэтую справу рэгістратар не пасьпявае толькі запісваць і выпісваць паперы, дык па аднаму толькі гэтаму магчыма судзіць аб тым патоку, які залівае ўстановы і не дае магчымасьці заняцца больш жывой і карыснай працай.

Тут неабходна ўсякаму праяўленьню бюракратызму і валакіты аб'явіць рашучую барацьбу, якую патрэбна весьці, папершаму, усяму сьвядомаму грамадзянству праз друк, і падругому, праз пашырэньне пр[ов]ядзеньня нарад усіх бліжка стаячых да справы адказных працаўнікоў і іншых сьвядомых у гэтых пытаньнях людзей.

Практыкаваньне нарад дасьць магчымасьць выявіць усё непатрэбнае, высьветліць шляхі да ўпрашчэньня і рацыяналізацыі справаводства і ўзбагаціць вопыт праз абмен дасягненьнямі.

На мой погляд, з чым цалкам згаджалася і ўся нарада, рэгістрацыя папер у асобных журналах мала патрэбна і без яе зусім лёгка можна абыйсьціся; асабліва трэба прыняць пад увагу, што гэтым скароціцца штат і выдаткі, калі завесьці строгую намэнклатуру спраў; кожнай паперцы прыбываючай і выбываючай прысваіваць нумар справы, куды яна пойдзе.

Х. А.

Хто адказны за сьмерць батрачкі?

(Чэрвень, Меншчына).

У саўхове «Новыя Зеленькі» здаўна служыла батрачка Равіна Флёрыана, удава, якая мае 5 дзяцей, з якіх старэйшаму сыну—14 гадоў, а меншаму—4 гады.

У апошніх лічбах кастрычніка месяца, у восеньнюю сьцюжу, загадчык саўхову (ці хто там) удумаў накапаць гліны і з гэтай мэтай паслаў Равіну, адну, у лес, капаць гэтую самую гліну, у яме, дзе быў даволі вялікі падкоп. Зірнуўшы на гэту яму, і сьляпому відаць было-б, што яна павінна абваліцца. Але баба не магла пайсьці супроць «прыказу начальства»...

Неўзабаве верх падкопа абарваўся і... пахваў пад сабою жанчыну... Калі-ж яе адкапалі, дык прысутны фэльчар знайшоў: злом у яе левай нагі, левых скаб і... сьмерць! Ну, як водзіцца ўсюды — пабедавалі, пабедавалі і забыліся.

І вышла, што дзяцей убірай з саўхозу. Жывуць яны пад плотам, бо адплаты на выхаваньне сірот саўхоз адмовіўся.

Добра, што знайшоўся сваяк, нейкі Юркевіч Нічыпар з вёскі Кляніх, Смалявіцкага раёну, і забраў дзяцей, але і той, маючы сваіх поўную хату, надта ня можа клапаціцца аб іх.

Хто-ж будзе аб іх клапаціцца?

М. Н-іч.

Калі ж атрымаем пэнсію...

(Барысаў-Калінінск-Менск)

Летась у Нова-Барысаве існавала прафтэхшкола. З пачатку новага бюджэтнага году гэтая школа была пераведзена ў г. Калінінск, з прычыны адсутнасьці памяшканьня ў Нова-Барысаве. Пакуль разьвязвалася пытаньне аб пераводзе гэтай школы, працаўнікам ня выплацілі пэнсіі ў разьмеры 170 р. 91 к. 26-га верасьня 1926 г. працаўнікі вышэйпаказанай школы падаюць заяву загадчыку Калінінскай прафтэхшколы аб выплаце ім пэнсіі за гэты час. Загадчык Калінінскай прафтэхшколы 30-га верасьня за № 817 накіроўвае гэтую заяву ў Калінінскае акрпрацасьветы. Калінінскае Акрпрацасьветы ня маючы магчымасьці намейсцы вырашыць гэтую справу, 4-га лістапада за № 528 накіроўвае ўсю гэтую перапіску ўжо на 3-х лістох у Барысаўскае Акрпрацасьветы.

З Барысава гэтая перапіска 17-га лістапада за № 736 накіроўваецца ў ЦП Белпрацасьветы.

Такім чынам перапіска расьце. 4-га сьнежня 1926 году ЦП Белпрацасьветы накіроўвае гэтую перапіску ў Наркамасьветы.

Лёс гэтай справы ў Наркамасьветы невядом. Толькі нейкім чынам 12-га студзеня 1927 года за № 42 ЦП Белпрацасьветы зноў вакіроўвае гэтую перапіску ў Барысаўскае Акрпрацасьветы ўжо на 6-ці лістох. Калі скончыцца ўся гэтая справа, невядома, а працаўнікі прафтэхшколы і да гэтага часу чакаюць сваей пэнсіі.

Н. Д.

ЗАВОЗ ХЛЕБА І ПЫТАНЬНЕ АБ СЫРАВІНЕ.

Ужо ня раз адзначалася ў нашым друку, што сельская гаспадарка БССР у адносінах вытворчасьці сельска-гаспадарчых прадуктаў дасягнула даваеннага ўзроўню. Гэта відаць з таго, што вытворчасьць хлеба скарачаецца за кошт адпаведнага росту тэхнічных культур, як больш рэнтабельных для сялянскай гаспадаркі.

Разьвіцьцё сельскай гаспадаркі ў такім напрамку (бясспрэчна, правільным і пажаданым) у першую чаргу залежыць ад суадносін цэн лёну-валакна, лёну-насеньня, хлеба і іншых сельска-гаспадарчых культур, а правільныя суадносіны цэн залежаць ня толькі ад становішча цэн на лён, але, пераважна, ад становішча цэн на хлеб. Правільная-ж цана будзе на хлеб пры умове поўнага здаваленьня ім лёнаводных раёнаў.

У 1925-26 годзе ўвесну былі выпадкі значных перабояў у завозе хлеба ў лёнаводныя раёны (Віцебск, Полацак і іншыя акругі), з прычыны чаго цэны на хлеб узрасьлі ў некаторых мясцох да 2 р. 50 кап. і да 3 руб. за пуд. Пры стабільнасьці цаны на лёна-валакно суадносіны між цэнамі лёна-валакно і хлеба зьмяніліся ў няспрыяючы бок для лёну. Пад уплывам такіх суадносін цэн летась спынілася далейшае пасьпяхоўнае пашырэньне засеўнай плошчы пад тэхнічныя культуры.

Вось чаму ва ўмовах БССР асабліва значэньне набывае пытаньне аб своечасовай і поўнай дастаўцы ў лёнаводныя раёны хлебных прадуктаў.

Згодна апошняга хлеба-фуражнага балянсу ЦСУ выяўлен дэфіцыт больш 14-ці мільёнаў пудоў. Калі дадаць яшчэ патрэбнасьць Гомельшчыны ў хлебе, якая не ўвайшла ў гэтыя лічбы, дык сума хлеба-фуражу, якога не хватае для патрэб БССР, яшчэ павялічыцца.

Зразумела, што пры такім хлеба-фуражным дэфіцыце цэнтр цяжкасьці загатоўчых і рэгулюючых органаў БССР пераносіцца на завоз хлеба з па-за БССР. Калі паглядзець на сёлетнюю хлеба-фуражную справу, дык трэба сказаць, што калі і былі некаторыя перабоі завозу хлеба ў пачатку загатоўчай кампаніі, дык зараз завоз хлеба на Беларусь наладжан нармальна. Згодна даных ЦСУ завезена (апроч Гомельшчыны):

у жніўні	629	тыс.	пуд.
» верасьні	919	»	»
» кастрычніку	1246	»	»
» лістападзе	1561	»	»
» сьнежні	1717	»	»
Разам	6072	»	»

Разьмер завезенага хлеба ў лістападзе і сьнежні цалкам забясьпечвае бягучыя патрэбнасьці і нават дае магчымасьць скласьці бліжка што месячны запас.

У сувязі з павялічэньнем забясьпечанасьці БССР хлебам адпаведна зьмяньшаюцца і цэны.

Пасьля некаторага павялічэньня цэн у верасьні і яшчэ ў пачатку лістапада—зараз хлебны рынак увайшоў у нармальную каляю.

Цана на хлеб у 1 р. 34 кап. у сярэднім па БССР набліжаецца да той нармальнай цаны на хлеб, якая вызначаецца ўзроўнем загатоўчай цаны ў выробных раёнах з надбаўкаю кошту чыгуначнага тарыфу і іншых загатоўчых і транспартных выдаткаў.

У пачатку кампаніі наглядаліся часты зьявішчы, калі нават заможныя сяляне закуплялі ў нашых загатоўцаў завезены хлеб вазамі, як відаць, баючыся недастачы хлеба ўвесну, як гэта было летась. Аднак, не зважаючы на павялічаны попыт на хлеб, у пачатку кампаніі бясспрэчна павялічаны завозам попыт быў поўнасьцю здаволен, і цэны сталі зьніжацца.

Поруч з дасягнутымі посьпехамі ў завозе хлеба па БССР у цэлым, да апошняга часу наглядаліся ў галіне дастаўкі іншыя недахваты. Папершае, пры наліччы значных запасаў хлеба ў акруговых гарадох ня было патрэбнага завозу яго ў мястэчкі і вёску. У сувязу з гэтым у некаторых раёнах і гарадох цэны на хлеб былі значна таньнейшымі, чымся ў вясковых мясцовасьцях.

Трэба перад нашымі каапэратывамі паставіць задачу большага здаволеньня вёскі хлебам. Трэба перакінуць у лёнаводныя раёны і мець заўсёды ў мястэчках частку ўрадавага манэўранага фонду.

Шляхам большага здаволеньня патрэб хлебам неабходна скласьці нармальнае становішча хлебнага рынку, асабліва ў лёнаводных раёнах, каб сяляне былі пераконаны, што недахвату ў хлебе няма, каб сяляне замест засеву хлеба пашыраў-бы засеў тэхнічных культур.

Далей, наглядалася зьявішча, што нашы загатоўцы завозілі ў вёску муку па значна павялічаных цэнах, прычым бывалі выпадкі, што якасьць мукі не адпавядала патрэбе сялян.

Каб упарадкаваць гэтыя пытаньні, для вёскі ў пляновым парадку выгружаецца збожжа, у першую чаргу для лёнаводных раёнаў. На сьнежань, студзень, люты дадзен нарад бліжка што на 300 тысяч пудоў жыта для БССР.

Мясцовыя ўстановы павінны прасачыць за тым, каб завознае жыта сапраўды было накіравана ў вёску. Рашуча павінна біць адхілена спроба некаторых мясцовых устаноў выкарыстаць гэта жыта з мэтаю нагрузкі сваіх млыноў. Гэта выклікае ізноў падаражаньне хлеба. Неабходна здаволіць у першую чаргу попыт вёскі на збожжа.

Адначасна НК Гандлю ўстанаўляе цьвёрдыя гранічныя продажныя цэны на завезены хлеб ў лёнаводныя раёны.

На радыусе у 5 вёрст ад чыгункі ўстаноўлена продажная розьнічная цана на жыта ў 1 р. 34 к. за пуд; абойная мука—1 р. 69 к.; пшанічная 4-га гатунку—1 р. 49 к., а пшанічная „Колас" і жытняя простага памолу—1 р. 59 к.

Устанаўленьне цьвёрдай продажнай цаны на завозны хлеб дасьць устойчывасьць, спыніцца ваганьні цэн, а гэтым заспакоіцца хлебны рынак.

Усе гэтыя мерапрыёмствы па здаволеньню лёнаводных раёнаў больш танным хлебам павінны спрыяць павялічэньню засеваў тэхнічных культур.

Адначасна зроблены ўжо папраўкі ў бок некаторага павялічэньня цэн на лёна-валакно і лёна-семя ўстанаўляюць больш спрыяльныя суадносіны між хлебам і лёнам: цана жыта 1 р. 34 кап. і льнянога семя 95 проц. дабротнасьці—1 р. 90 кап., што дае прыблізна, 1:1 з пал. Сярэдні гатунак лёна-валакна (12) 5 р. 40 к. да 1 р. 34 кап. жыта складае 1:4. Калі ўзяць лёна-валакно лепшай якасьці, дык суадносіны павялічацца на карысьць апошняга.

Такім парадкам, у прапорцыі цэн лёна-семя і жыта дасягнуты нармальныя суадносіны, а ў галіне валакна трэба яшчэ ўжываць заходы да далейшага палепшаньня.

Але гэтыя мерапрыёмствы павінны ісьці ня толькі ў напрамку большага дасягненьня ў суадносінах сучасных цэн, але, пераважна, у напрамку палепшаньня якасьці лёну, што ў свой чарод,—у напрамку адпаведнага павялічэньня цаны на лёна-ва[...]

* * *

Дасягнуты ўзровень [...] прадуктаў і зьніжэнь[...] мацаваць. Нашы хлебаза[...] перацыя і Хлебапрадукт) [...] асаблівую ўвагу з своечас[...] лейшым да пытаньняў дас[...] ў лёнаводныя раёны па [...] больш танных цэнах.

Нармальнае забясьпечань[...] асабліва ў веснавы перыяд, б[...] ваю для далейшага разьвіцьця тэхнічных культур.

І. Адама[...]

УЗРОСТ КУЛЬТУРЫ У БССР.

(Уражаньні ад юбілею артыста БДТ І Ф. П. Ждановіча).

Здаецца, можна было-бы ўжо за 8 месяцаў перабываньня ў межах Савецкай Беларусі прывычаіцца да таго вялікага уздыйму беларускай культуры, вагромністы размах якой магли толькі прыдаць вялікі Кастрычнік і савецкая ўлада на Беларусі, якая так правільнова, як нідзе на сьвеце, здолела ня толькі прынцыпова вырашыць нацыянальнае пытаньне, але і на справе правяла яго і надалей праводзіць у жыцьцё. Амаль кожны дзень прыносіць нам нешта новае.

За невялікі тэрмін майго перабываньня ў Савецкай Беларусі, як у калейдаскопе, мне прышлося бачыць і быць жывым сьведкам трыумфальнага паходу беларускай культуры, як культуры працоўных гушчаў Беларусі.. Беларуская Акадэмічная Канфэрэнцыя, адчыненьне Дзяржаўнага Яўрэйскага Тэатру, юбілей народнага паэты Якуба Коласа, адчыненьня Другога Дзяржаўнага Беларускага Тэатру ў Віцебску, юбілей Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту, літаратурныя юбілеі „Полымя“ і «Маладняка» і ў самыя апошнія часы—адчыненьне Навукова-Дасьледчага Інстытуту сельскай і лясной гаспадаркі імя Леніна і 25-цігадовы юбілей артыста БДТ І. Ф. Ждановіча.

Ніводзін беларус, дзе бы ён ні знаходзіўся, незалежна ад яго поглядаў і адносін да савецкай ўлады, ня можа ня прызнаць (і гэтым самым належна не ацаніць!), што такія спрыяючыя ўмовы посьпеху і разьвіцьця беларускай культуры адзіна маглі даць камуністычная партыя і савецкая ўлада на Беларусі.

Кажу адзіна, бо за доўгія гады блуканьня заграніцай усе беларускія эміграцкія групоўкі, не залежна ад іх адносін да савецкай ўлады, на ўласнай скуры пераканаліся, што прадстаўнікі і дзеячы усіх расейскіх партыяў—ад крайніх правых да крайніх «левых»—перабываючыя на нашае шчасьце на эміграцыі, занадта яўна здолелі выявіць свой сапраўдны варожы твар у адносінах да вырашэньня беларускага пытаньня на справе, спрытна хаваючыся за туманнымі лёзунгамі партыйных праграм.

Довадам гэтага служыць тая эміграцкая расейская прэса да апошніх дзён...

І вось на фоне ўсяго гэтага, на крывавым фоне апошніх падзей у Заходняй Беларусі (адкуль я сам родам паходжу), дзе так інтэнсыўна апошнія часы праводзіць масавы белы тэрор проці працоўных, дзе панскі бот пана Пілсудзкага стараецца арыштамі, кайданамі і крывёю задушыць і рэвалюцыйна-нацыянальны і сацыяльны ўздым беларускага працоўнага народу, кідаючы без усякіх падстаў у турмы нават проці ўсіх законаў прагнілага „парляментарызму“ «недатыкальных» дэпутатаў сойму «Рэчы Паспалітай», якія стаяць на чале гэтага нацыянальна рэвалюцыйнага руху, каб самым фактам подлага насільства даць належную «острастку» і яшчэ больш прыручыць згодніцкія беларускія і інш. нацменшасьцяў групоўкі ўсіх адценяў.

І на цёмным фоне гэтага ўсяго, такога сумнага і жудаснага, ва ўмовах дыктатуры пралетарыяту ў БССР яскравы, квяцісты трыумф беларускай культуры наогул і беларускага мастацтва ў прыватнасьці.

Мне здаецца, што кожны, хто быў на сьвяткаваньні 25-цігадовага юбілею артыста Ф. Ждановіча, мусіў гэта адчуваць.

За тэатральны сэзон давалося мне пабачыць на сцэне Беларускага Дзяржаўнага Тэатру манумэнтальныя пастаноўкі Мальераўскага рэпэртуару, а таксама «Каваль—Ваявода», „Вір“, «Кастусь Каліноўскі», «Панскі Гайдук», адну дзею «Русалкі» і інш.

Такія шпаркія дасягненьні беларускага тэатру толькі і можна аб'ясьніць тым вялікім значэньнем, якое надае ўлада рабочых і сялян тэатру, як вялізарнаму фактару праводу ідэй пралетарскай культуры сярод працоўных мас.

Паміма волі ўспамінаюцца мне пецярбурскія часы пэрыяду 1909-1914 г. г., калі з такімі труднасьцямі прыходзілася наладжваць тэатральныя пастаноўкі (і то ня больш аднаго разу на год!), як дзеля недахопу артыстычных сіл і сродкаў, так яшчэ ў большай меры—дзеля суровых перашкод з боку царскай ўлады, якая ў беларускіх спэктаклях заўсёды бачыла «крамолу інародцаў»... Помню, першую беларускую вечарынку паліцыя дазволіла правесьці толькі пад відам фамілійнага сьвяткаваньня „заручын“ студэнта Ф. Умястоўскага, які нібыта, запрасіў на гэтыя «заручыны» сваіх добрых знаёмых!..

Але і фамілійнасьць заручын не пазбавіла „шчасьлівага жаніха“ ад частых адведзін напрошаных гасьцей—«фараонаў»—гарадавікоў. Каб ня было пратаколаў за рэвалюцыйныя дэклямацыі, прыходзілася «жаніху» ад кожнага няпрошанага гасьця адкупацца ня толькі сярэбранікамі, але і добрым літоўскім мёдам—„крупнікам“...

Беларускія пастаноўкі карысталіся асаблівай папулярнасьцю сярод рабочых—беларусоў Пуцілаўскага і інш. заводаў Пецярбургу, дзе да 80-90 пр. білетаў распрадавалася заўчасу; прыходзіла-ж куды больш людзей і, пасьля распрадажы ўсіх білетаў, пушчалі проста без білетаў, бо жадаючых глядзець пастаноўкі у роднай мове было надта шмат. На гэтым тле састаўлялася паліцыяй па некалькі пратаколаў за вечар, бо і ў гэтым бачылі паміма фармальнага моманту, таксама «крамолу».

Цяпер усе гэтыя сумныя і цяжкія часы даўно мінуліся і, веру, ніколі ня вернуцца.

І калі менскі глядач у такой агромністай колькасьці ушанаваў сваёй прысутнасьцю юбілей Ф. Ждановіча, то гэтым ён падкрэсьліў, што Белар Дзярж. Тэатр сваімі мастацкімі пастаноўкамі заваяваў масавага гледача і гэтым самым забясьпечыў сабе слаўную будучыню на шляху разьвіцьця пралетарскага мастацтва, на шляху к сацыялізму, дзе роля тэатру—не апошняя.

А. Заяц.

З жыцьця беларусаў ў Чэха-Славакіі

Урачысты вечар-канцэрт з прычыны 20-цігадовага юбілею мастацкай творчасьці Якуба Коласа.

(*Ліст з Прагі*).

13 студзеня 1927 г. беларуская савецкая калёнія ў Чэхіі сьвяткавала 20-ёхгодьдзе літаратурна-мастацкай творчасьці Якуба Коласа. Як калісь, у 1925 г., пры сьвяткаваньні юбілею Я. Купалы, арганізатарам сьвяткаваньня ізноў стаў праскі „Маладняк“.

Шмат часу і энэргіі прышлося затраціць на тое, каб вядомы ня толькі ў Чэхіі, але і за яе межамі, „Чэскі хор Бакулы“ вывучыў да юбілею некаторыя беларускія народныя песьні.

Зацікаўленасьць колаў чэскага грамадзянства павялічылася тым, што рэфэрат на вечары аб творчасьці Я. Коласа ўзяўся прачытаць вядомы чэскі вучоны прафэсар Д. Нэедлы.

Той посьпех, які меў вечар-канцэрт сярод грамадзянства, быў саўсім нечаканы. Вялікая „Жоўтая Заля“ Акадэмічнага Дому ў Празе літаральна не магла зьмясьціць у сабе ўсіх прысутных. Не хапала места ня толькі сядзець, але нават і стаяць. Былі прысутнымі, апрача амаль усіх беларускіх студэнтаў розных палітычных кірункаў, прадстаўнікі студэнцтва чэскага, баўгарскага, літоўскага, яўрэйскага, басарабскага, расейскага, украінскага, грузінскага і інш. У значным ліку прышлі прадстаўнікі розных чэскіх літаратурных групаваньняў, часопісаў, грамадзкіх арганізацый, супрацоўнікі савецкіх замежных прадстаўніцтваў у Чэхіі і г. д.

Вечар-канцэрт адчыніўся пяяньнем «Інтэрнацыяналу»—першы раз у Чэхіі на беларускай мове. Гымн працоўных быў надзвычайна прыгожа выканаы «Інтэрнацыянальным студэнцкім хорам» пад кіраўніцтвам маладога чэскага кампазытара тав. Крайчі'го. Пасьля гэтага старшыня акадэміі маладняковец тав. Асот у кароткім уступным слове ад імя „Маладняка“ і ўсяго беларускага савецкага і паступовага студэнцтва ў Чэхіі падкрэсьліў значэньне творчасьці Я. Коласа для бел. культуры, якая мае магчымасьць так пышна расквітаць толькі пры ўлядзе працоўных—уладзе савецкай.

У сваёй прамове наступны прамоўца—радньік паўнаважнага прадстаўніцтва СССР у Чэхіі тав. Калюжны казаў, што наймалодшы са ўсіх славянскіх народаў, які да рэвалюцыі ня меў яшчэ свайго ўстаноўленага правапісу, зараз, дзякуючы сав. уладзе, сямімільнымі крокамі ідзе наперад да агульна-людзкай культуры і дабрабыту, нага ў нагу з іншымі народамі, членамі адной вялікай сям'і працоўных—СССР. Прыкладам гэтага росту бел. культуры і ёсьць творчасьць Якуба Коласа, якога юбілей мы сьвяткуем.

Потым прачытаў свой надзвычайна каштоўны рэфэрат аб творчасьці Я. Коласа праф. Д-р Нэедлы на чэскай мове, які з вялікім зацікаўленьнем слухала цэлая заля, асабліва чэская яе частка. Праф. Нэедлы раўняе творчасьць Я. Коласа з творчасьцю Я. Купалы. Я. Купалу Нэедлы называе народным трыбунам, арганізатарам.

Асноваа паэзіі Коласа—родная зямля—Беларусь, якая гаворыць да яго рознымі мовамі. Не абы якія людзі жывуць у Беларусі: жывуць там беларусы. Але дужа памыліўся-б той, хто парахаваў-бы Коласа ідэалістам. Ён—чысты рэалісты, які дае ў сваіх творах Беларусь такою, якою яна ёсьць, не падкрашваючы яе.

Колас мае вялізарную энэргію, клічучы беларусоў, каб яны змагаліся за лепшую будучыню, асабліва ў сваіх „Песьнях Жальбы“.

Мы зараз на пачатку сацыяльна-рэвалюцыйных баёў, а ўсё тое, што кліча да змаганьня, што рэвалюцыйна,—мы вітаем! На гэтым канчае свой рэфэрат аб Коласе праф. Нэедлы.

Пасьля рэфэрату пр. Нэедлага адбыўся вялікі канцэрт з дэклямацыяй твораў Я. Коласа. Асабліва добрае ўражаньне зрабіла калектыўная дэклямацыя, якую з рэвалюцыйным запалам выканалі маладыя беларускія студэнты.

Два хоры: „Хор Бакулы“ і „Інтэрнацыянальны Студэнцкі Хор“ выканалі шмат беларускіх народных песьняў. Выкананьне абодвых хораў было такое мастацкае, што пасьля нясупынных „біс'аў“ прысутных некаторыя песьні сьпявалі па некалькі разоў.

Ад імя прысутных юбіляру была паслана гарачая прывітальная тэлеграма.

Наогул, вечар канцэрт зрабіў вялізарнае ўражаньне на прысутных і многіх зацікавіў, асабліва чэскае грамадзянства, шляхамі разьвіцьця маладой беларускай літаратуры і культуры.

Акрылены вялікім посьпехам і асабліва зацікаўленасьцю чэскага грамадзянства, праскі „Маладняк“ думае на вясьне 1927 г. уладзіць у Празе вялікі вечар беларускай песьні і музыкі. Ужо далі сваю згоду на актыўны ўдзел у арганізацыі гэтага вечару некаторыя чэскія грамадзкія і мастацкія арганізацыі. Уся справа залежыць толькі ад таго, як удасца дастаць адпаведныя матар'ялы, асабліва ноты для жаночага ці мужчынскага хору, а таксама і беларускія песьні для сьпеву сола.

Праскі „Маладняк“ спадзяецца, што яго імкненьні падтрымаюць адпаведныя беларускія ўстановы і грамадзянства, і гэтым самым дадуць яму магчымасьць хоць крыху пазнаёміць грамадзянства ў Чэхіі з дасягненьнямі беларускай культуры працоўных.

Прысутны.

Прага-Чэская, 14 студзеня 1927 г.

Будзем змагацца за „свой Кастрычнік“.

50 год рэвалюцыйнаму рабочаму руху ў Польшчы. 50 год арганізаванай барацьбы, за лепшую сьветлую будучыню, за сацыялізм. Польскія рабочыя пачалі сваю барацьбу адначасова з расейскімі. А якая розьніца ў лёсе.

Расейскі рабочы ўжо сваімі рукамі кіруе жыцьцём, польскаму-ж рабочаму яшчэ прыходзіцца змагацца з сваёй жандармэрыяй, каб перамагчы, каб зрабіць і ў сабе свой Кастрычнік.

28-го студзеня адзначыць гэты рэдкі гістарычны юбілей сабраліся польскія рабочыя і партыйцы ў клюбе імя К. Маркса Г. Сьцэны залі дзе адбываецца сход, убраны лёзунгамі і партрэтамі польскіх рэвалюцыянэраў.

Тав. Славінскі, адчыняючы ўрачысты сход, запрасіў у прэзыдыум т. т. Гельтмана, Ігнатоўскага, Віароўскага, Ашэровіча і інш.

Надзвычайна цікавы даклад аб гісторыі рэвалюцыйнага руху ў Польшчы на сходзе зрабіў тав. Гельтман.

Ён адзначыў, што сёньня споўнілася дзьве гадавіны 50 гадоў рэвалюцыйнай барацьбы польскіх рабочых і мінула 41 гадавіна з дню казьні першых 4-х вядомых польскіх рэвалюцыянэраў (Куніцкі, Пятрусінскі і інш.)

Гісторыю рэвалюцыйнай барацьбы ў Польшчы за мінулыя паўвека, дакладчык разьбіў на 7 пэрыядаў: 1 пэрыяд 1876 году па 1882 вядзецца падрыхтоўчая праца, арганізуюцца рэвалюцыйныя гурткі, другі пэрыяд ад 1882 году па 86 характарызуецца арганізацыяй першай рэвалюцыйнай сацыялістычнай партыі «Пралетарыят» і працэсам 29 рэвалюцыянэраў, трэці пэрыяд цягнецца ад 1886 па 1893, у час якога арганізуецца новая рэвалюцыйная партыя пад назвай «саюз польскіх рабочых», актыўны ўдзел у арганізацыі якога прымалі т. т. Мархлеўскі і Барскі. Канец гэтага пэрыяду характарызуецца аб'яднаньнем двух партый і арганізацыяй ППС, 4-ы пэрыяд цягнецца ад 1893 па 1900 год—у час якога ў Польшчы нарадзілася сацыял-дэмакратычная партыя, у якой актыўна працуе Р. Люксэмбург, Тышко, Весялоўскі і інш. Паты пэрыяд ад 1900 па 1906 год—аб'яднаньне польскай сацыял-дэмакратычнай партыі з літоўскай (ЭСДП и Л.), пачаў сваю рэвалюцыйную дзейнасьць у Вільні т. Дзяржынскі.

6 пэрыяд які цягнецца 12 год (ад 1906 па 1918) характарызуецца наступным: ППС скацілася ў балота апартунізму і адколам левіцы ад ППС. Арганізацыя камуністычнай партыі.

7-ы пэрыяд ад 1918 году па сёняшні дзень, яскрава выяўляе здрадніцкую палітыку ППС і рост КПП.

Далей на сходзе выступіў т. Ігнатоўскі, які правёў роўналежную лінію паміж рэвалюцыйным рухам у Польшчы і Беларусі. Сваю прамову т. Ігнатоўскі закончыў наступнымі словамі:

— Слаўныя, шматгадовыя традыцыі старых польскіх рэвалюцыянэраў не засталіся без сьледу, яны прывядуць польскіх рабочых да свайго кастрычніка.

На ўдзеле жанчын у рэвалюцыйным руху Польшчы спыніліся т. Аскерка.

Сход аднагалосна прыняў рэзалюцыю у якой, пасылае шчырае прывітаньне польскім рабочым, якія пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі—здабываюць сабе свабоду.

Далей сход паслаў прывітальную тэлеграму старэйшаму польскаму рэвалюцыянэру Ф. Кону, і апрача таго даручыў прэзыдыуму паслаць прывітальны ліст КПП тав. Ланчуцкаму і 5 арыштаваным беларускім дэпутатам.

Я. С.

Мастацкая праца на вёсцы.

Любому наглядальніку жыцьця нашае вёскі, якое яно ёсьць зараз, кідаецца ў вочы вельмі значны рост інтарэсу шырокіх сялянскіх мас да мастацтва. Прычыну гэтаму трэба канешне шукаць у росьце матар'яльнага дабрабыту нашае вёскі, у нясупынным росьце грамадзянскае актыўнасьці гэтых мас, у імкненьні апошніх да культуры. Галоўным чынам шырока распаўсюдзіліся па вёсках мастацкія гурткі, у пераважнасьці драматычныя. Узрост інтарэсу працоўных мас вёскі да тэатру, як вынік імкненьня іх да культуры, справаджваецца выяўленьнем самадзейнасьці вясковых мас у напрамку ўтварэньня драматычных гурткоў, каб праз іх мець магчымасьць карыстацца тэатрам у сябе дома, на вёсцы, куды тэатральныя калектывы ніколі заглянуць ня могуць.

Як вынік самадзейнасьці мас, гэтая зьява заслугоўвае самага шырокага падтрымліваньня, тым больш, што сіламі [illegible] драмгурткоў выконваецца культурнае (у агуле) абслугоўваньне тэ[illegible] адпаведным глыбокае пра[illegible] ўдзяюцца творчыя сілы [illegible]ас па задавальненьню сваіх [illegible]атрэб. [illegible]стацкі ўзровень гэтых тэ[illegible]вішч ня вельмі высокі [illegible] Мастацкая вартасьць [illegible] зьніжаецца ня толькі [illegible]доутнасьці належнага [illegible]ўніцтва драмгурткамі, [illegible]ўкі спэктакляў [illegible] не даканчва[illegible] разглядаць [illegible]дзін з кап[illegible] ёмную самалюбству ўдзельнікаў драмгуртка; або пастаноўцы спэктаклю прыдаецца толькі роля апарату па здабычы патрэбных сродкаў.

Між тым, калі ўлічыць выключна важную ролю мастацтва, тэатру, як спосабу палітычна-грамадзянскага выхаваньня мас, як фактара арганізацыі клясавае самасьвядомасьці гэтых мас, дык трэба падумаць нарэшце і аб упарадкаваньні гэтага боку нашага культурнага жыцьця, аб уцягненьні ў справу будовы і дзейнасьці драмгурткоў плянавасьці, аб арганізацыі належным чынам гэтай важнейшай палітасьветнай справы. Гэта трэба зрабіць без далейшага адкладу яшчэ таму, што дробна-буржуазная, інакшай нацыянал - дэмакратычная ідэолёгія больш заможных колаў вёскі шукае свайго афармленьня. А таму трэба мастацка-культурны рух накіраваць належным логавам, падтрымаць у ім выяўленьне самадзейнасьці бядняцкіх і серадняцкіх элемэнтаў беларускае вёскі, выкарыстаць гэты сродак культурнага ўплыву і выхаваньня вясковых мас.

Праўду-ж кажучы, на месцах нізавыя палітасьветныя ўстановы або зусім мала ўдзяляюць увагі мастацкай працы на вёсцы, або дбаюць толькі аб выкарыстаньні драмгурткоў пры кампаніях самым павярхоўным спосабам, у той час калі ўжо паглыбіліся самыя формы новага жыцьця нашае сучаснае вёскі. Ды што і казаць пра ніз нашае палітасьветнае сыстэмы, калі з боку акругі, а нават і цэнтру [illegible]ба адзначыць і недахват адпавед[illegible] брак [illegible] і на[illegible]ў, а таксама і адпаведнага мастацкага матар'ялу.

Вёска, рабёа астаюцца самі з сабою: на месцах ставіцца рэпэртуар, ня толькі далёкі нашай вялікай сучаснасьці, але шкодны хлам, які росьціць чыста мяшчанскі нездаровы смак да сцэны, як спосабу паласкатаць горшыя з чалавечых пачуцьцяў.

Больш таго, нашая правінцыя сама творыць надобны рэпэртуар, перакладаючы на беларускую мову «Генеральш Матрёна» і нават водэвілі фарсавага зьместу. Праўда, побач з гэтым масьцінамі ідзе і выяўленьне творчае самадзейнасьці ў напрамку напісаньня п'ес, якія-б задаволілі патрэбу шляхам адказу на нашыя сучасныя патрэбы ўзьняць палітычна-грамадзянскую самасьвядомасьць працоўных мас. Аўтарамі зьяўляецца тут часта настаўніцтва і Менск часьцінна знаёмы з такімі вырасшымі ў шырокай правінцыі маладымі драматургістымі. Конкурс п'ес для вясковага тэатру сабраў чуць не паўтараста падобных п'ес.

Што-ж мы так і адмаўчымся ад патрэбы наладзіць як сьлед мастацкую працу на вёсцы? Новыя-ж формы эканомікі вёскі пачынаюць ужо ўплываць на яе жыцьцё, твораць і новы ўклад яе жыцьця, новы быт, фармуюць сасьвядомасьць селяніна. У самы раз зараз выкарыстаць мастацтва, як спосаб уцягнуць прышоўшых да новага жыцьця масы ў сьвядомае будаўніцтва яго на новых сацыялістычных падставах. Тэатр—лепшы са сродкаў выхаваньня мас. Трэба ладзіць належным чынам культурнае жыцьцё нашае абуджанае ўжо вёскі.

Т. Кулеша.

ХРОНІКА.

Пленум т-ва „Чырвонага Крыжу“.

На гэтых днёх закончыў сваю працу пленум Менскага акруговага камітэту „Чырвонага Крыжу“.

Сярод іншых пытаньняў якія стаялі на пленуме была заслухана справаздача гадавой працы камітэту.

Менскае акруговае т-ва „Чыр. Крыжу“ зараз мае 30 ячэек з агульнай лічбай 5528 чалавек. Т-ва за гэты час правяло шэраг кампаній, з якіх асабліва пасьпешна прайшла кампанія па барацьбе з сухотамі. Для сялян т-ва арганізавала два пераговачныя зубаўрачэбныя габінэты, якія за апошні год прапусьцілі 2332 чалавекі. Т-ва на свае сродкі ўтрымоўвае дом бежанцаў на 100 чалавек.

Ячэйка Чырвонага Крыжу пры санаторыі „Красный Октябрь“ правяла ўсе падрыхтоўчыя працы да адчыненьня спэцыяльнага сухотнага дыспансэру для сялян.

Усяго за апошні год т-ва выдала 8898 р. на палепшаньне санітарных умоў вёскі, на арганізацыю зубаўрачэбных габінэтаў.

Па гэтай справаздачы пленум пастанавіў да 1928 г. лік сяброў т-ва па Менскай акрузе павялічыць да 15.000, арганізаваць летам лягер для піонэраў і ўзмацніць матар'яльную базу т-ва.

88 саветаў ужо пераабраны.

Па няпоўных вестках на 28-га студзеня па Менскай акрузе пераабрана 88 сельскіх і мястэчковых саветаў. На выбары зьявілася 67.145 чалавек ці 44,09 проц. агульнага ліку выбаршчыкаў.

У саветы абраны: сяброў КП(б)Б—163, ЛКСМБ—140 і жанчын—108.

Новыя працоўныя калектывы.

Менскае акруговае кіраўніцтва працоўных калектываў арганізавала ў горадзе тры новыя калектывы па вырабу дзіцячых цацкаў, кошачны прац. калектыў і па транспартных справах. У новых калектывах занята звыш 150 беспрацоўных.

Праца мастацкай камісіі.

Мастацкая камісія пры яўрэйскім аддзеле Інбелкульту за апошні год значна разгарнула сваю працу.

Зараз камісія рыхтуе да выданьня некалькі манаграфіяў вядомых мастакоў, якія нарадзіліся на тэрыторыі Беларусі і прыступіла да вывучаньня рамесьніцкай мастацкай роспісі пачынаючы з XVII стаг.

Слухаюць Менскую радыё-станцыю.

Менская шырока-вяшчальная радыё-станцыя імя СНК атрымала ліст з Латвіі, у якім пішацца, што перадача Менскай радыё станцыі выразна чутна заграніцай.

Асаблівым посьпехам заграніцай карыстаецца беларуская народная музыка.

СУД.

Маці ўтапіла дзіцё.

Выязная сэсія Менаксуду.

У канцы лютага 1926 году рака Бярэзіна рыхтавалася да шырокага разводзьдзя.

У той час праз мост рэчкі Бярэзіны праходзіла гр. сяла Велеціч Марфа Каба 20 гадоў, радзіўшая ў г. Барысаве ў бальніцы дзіцё, якое яна несла на руках.

На мосьце Каба спынілася, агледзілася, што нікога няма і кінула дзіця ў раку. Каба за злачынства аддана пад суд.

Выязная сэсія Менскага акруговага суду ў м. Барысаве прызнала Марфу Кобу вінаватай па 142 п. д. арт. Крым. Код. прысудзіла на восем гадоў турмы, але і прымаючы пад увагу цяжкае становішча Кобы, скараціла пакараньне да 4 гадоў і пакінула яго ўмоўным у працягу 3-х гадоў.

Кастроў.

Забойства мужа.

(Мазырскі акр. суд).

Героі гэтай справы—Домна Канонка-Бычко і Піліп Іваніс з вёскі Беразцы, Мазырскай акругі.

Домна Бычко—жонка забітага Ільлі Бычко—некалькі раз разводзілася з сваім мужам, увесь час сварылася з ім.

Піліп Іваніс меў з забітым розныя судовыя справы, быў з ім у сварцы. Іваніс сам некалькі раз быў прыцягнен да адказнасьці за розныя ўчынкі: за недазволенае захаваньне аружжа, за порчу казённай маемасьці, за няўплату прадпадатку, за дачу фінінспэктару хабара і г. д.

З папярэдняга і судовага сьледзтва устаноўлена, што Домна Канонка-Бычко згаварыўшыся з Іванісам, ночччу з 4-5 мая сякерай засекла Ільлю Бычко.

Першы ўдар быў зроблен па галаве, а пасьля па шыі.

Праступнікі ўлажылі труп у сані, апрануўшы яго на сьпех у адзін рукаў сьвіткі, адвезьлі да ракі.

Баючыся, каб труп ня ўсплыў на верх, яны накруцілі з лазы вітак і, прывязаўшы два камені, кінулі яго ў пролубь.

Мазырскі акруговы суд прыгаварыў Домну Канонка Бычко і Піліпа Іваніса, на падставе 142-а арт. Крым. Кодэксу, на 8 год зьняволеньня з суровым адмежаваньнем кожнага.

Суд пастанавіў даручыць Тураўскаму аддзелу народнай асьветы устанавіць апеку над малалетнімі дзецьмі Домны Бычко.

С. Азерскі.

Апавяшчэньні.

— У нядзелю 30 І у доме прац. асьветы а 5 ч. увечары адбудзецца агульны сход сяброў жыльлёва-будаўнічага кааперацыйнага таварыства «Праваўнік асьветы» для абгаварэньня чарговых спраў.

Праўленьне.

— У панядзелак 31 студзеня а 6 гадзіне увеч. у клюбе вучоных адбудзецца агульны сход членаў сэкцыі навуковых працаўнікоў.

Павестка—1—чарговыя задачы сэкцыі, 2—выбары дэлегатаў на ўсесаюзны і ўсебеларускі зьезды.

Там-жа а 5 гадз. сход камуністаў-членаў сэкцыі.

— Сёньня а 5 гадз. увеч. у памяшканьні 2 школы (Левінская, 21) адбудзецца агульны сход сяброў групкому № 2 саюзу працасьветы. На павестцы—падзеі ў Заходняй Беларусі.

Бібліяграфія.

Б. Д. Архангельский. Укрупненная БССР". Выд. рэд выд аддзелу Дзяржплану БССР. Менск, 1927 г., 82 стар. Ц.—60 к.

Зусім зразумела, што пасьля далучэньня да БССР Гомельскага і Рачыцкага паветаў у пэрыядычным нашым друку стала прыдзяляцца гэтаму пытаньню многа ўвагі і месца.

Аднак, усебакова высьвятліць значэньне гэтага факту ў кароткіх артыкулах немагчыма, і таму зьявілася патрэба выдаць спэцыяльную кніжку, высьвятляючую значэньне гэтага факта больш-менш з усіх бакоў. Брашура Б. Д. Архангельскага не дае вычэрпываючага матар'ялу па пытаньню аб значэньні далучэньня новых тэрыторый да БССР. „Пасьпешнасьць у рабоце і адсутнасьць выстарчаючых статыстычных матар'ялаў па Гомельскаму і Рачыцкаму паветах, напэўна, адбіліся на якасьці гэтай першай працы",—піша прадмоўца гэтай брашуры т. Карп. Так яно і ёсьць.

Аўтар вельмі мала гаворыць аб значэньні для гаспадаркі БССР далучэньня новых тэрыторый і пачынае свой нарыс з таго, што даўно вядома і многа разоў друкавалася ў шмат якіх выданьнях: аб важнейшых гістарычных момантах у жыцьці Беларусі, аб Кастрычніцкай рэвалюцыі, аб Рыскай умове, аб Канстытуцыі БССР, аб клімаце і г. д. Пасьля гэтага аўтар вельмі няпрыметна пачынае гутарыць аб насяленьні «укрупнённай» і аб іншых рэчах. Выглядае так, што перад чытачом ляжыць кніжка не па пытаньню аб значэньні далучэньня новых тэрыторый да БССР, а як бы падручнік для тых, хто нічога ня бачыў і ня чуў аб Беларусі.

Нам здаецца, што трэба было пачынаць не «ад Адама», а ад сучаснасьці—ад факта далучэньня, высьвятліўшы значэньне яго з усіх бакоў: з боку с.-гасп., прамысловага, нарэшце—гістарычнага і г. д. Адна ўцеха, што „пасьля гэтай першай памяткі, як гаворыцца ў прадмове, зьявіцца яшчэ цэлы шэраг навуковых дасьледаў па гісторыі і экапоміцы БССР". Будзем іх чакаць ад нашых вучоных.

Нявысокая цана брашуры—60 кап. робіць яе даступнай і таму, ня гледзячы на недахопы, яе можна рэкамэндаваць чытачам. Якні-як сёе-тое можна знайсьці ў гэтай ярысьпешанай кніжачцы.

П. Т.

ШАХМАТЫ.

№ 4 (104) 30-І 1927 г.

Пад рэдакцыяй А. Каспэрскага.

Задача В. Кобаця—Менск.



Мат у 3 хады.

Бел. Kpg7, Фe1. Ch1, Kc5 п.п. a3, d7, f2, g5 і h4.

Чорн. Kpd6, Cd8 п.п. a7, e7, f5, f6, g4.

Партыя іграна ў Мерано—Італія ў міжнародным турніры XII 1926 г.

Бел. Коль—Бэльгія, Чорн. Гроб—Швэйцарыя.

1. d2-d4, d7-d5. 2. Kg1-f3, Kg8-f6. 3. e2-e3 Cc8-f5. 4. c2-c4, c7-c6. 5. Kb1-c3, e7-e6. 6. Cf1-d3, Cf5:d3. 7. Фd1:d3, Cf8-d6. 8. 0-0, Kb8-d7. 9. e3-e4, d5:e4. 10. Kc3:e4, Kf6:e4. 11. Фd3:e4 0-0. 12. Cc1-g5, Cd5-e7. 13. Cg5-d2, Ce7-f6. 14. Cd2-c3, Фd8-c7. 15. Лa1-d1, Лf8-e8. 16. Лf1-e1, Лa8-d8. 17. h2-h4, g7-g6. 18. Kf3-g5, h7-h6. 19. Kg5-f3, c6-c5. 20. h4-h5, g6-g5. 21. Kf3-e5, c5:d4. 22. Ke5:f7! Kpg8:f7. 23. Фe4-g6+Kpf7-e7. 24. Cc3-b4+ Kd7-c5. 25. Фg6-h7+ Kpe7-d6. 26. Фh7:c7+ Kpd6:c7. 27. Cb4:c5. b7-b6. 28. Cc5-a3, e6-e5. 29. Лe1-e4! Kpc7-d7. 30. Kpg1-f1, Kpd7-e6. 31. b2-b3, Cf6-e7. 32. Ca3-b2, Kde6-f5. 33. f2-f3, a7-a5. 34. Kpf1-e2. a5-a4. 35. Kpe2-d3. a4:b3. 36. a2:b3, Ce7-b4. 37. Лd1-f1. Лd8-a8. 38. Лf1-f2. Лe8-e6. 39. Лf2-e2, Лe8-a2? 40. g2-g4+ Kpf5-f6. 41. f3-f4!! g5:f4. 42. Лe4:f4+ Kpf6-g5. 43. Лf4-e4! Kpg5-f6. 44. Лe2-f2, Kpf6-e7. 45. Cb2:d4! Лa2:f2. 46. Cd4:f2 Лe6-d6+. 47. Kpd3-e2 Kpe7-e6. 48. Cf2-e3, Лd6-d7. 49. Ce3:h6, Лd7-a7. 50. Ch6-e3. Лa7-a3. 51. h5-h6. Cb4-e7. 52. g4-g5 Kpe6-f5. 53. h6-h7, Лa7-a8. 54. Лe4-h4 Лa8-h8. 55. Ce3:b6, Ce7:g5. 56. Лh4-h1 Cg5-f6. 57. c4-c5, Kpf5-e4. 58. c5-c6, Kpe4-d5. 59. Лh1-h6, Cf6-e7. 60. c5-c7, Ce7-g5. 61. c7-c8Ф, Лh8:c8. 62. h7-h8Ф; чорныя здаліся. Другую палову партыі добра іграў Коль—пераможца турніру ў Мерано.

ХРОНІКА.

30-І а 11 з паловай гадз. у памяшканьні ВСНГ адбудзецца шахматны і шашачны сэанс адначасовае гульні супроць неагранічанага ліку ігракоў; даюць сэанс А. Каспэрскі і Прэсман.

НАВУКА І ТЭХНІКА.

Агрэмадная плавучая выспа.

У Амэрыцы распрацован праэкт вялікай плавучай выспы. Гэта выспа падобна да агрэмаднага парома плошчай у 43.200 квадратных мэтраў—пяць раз больш за палубы самых вялікіх авіяносцаў. Выспа ўстаноўлена на высокіх стойках, якія прымацаваны да мэталічных плаўкоў. Выспа ўзьнімаецца на 20 мэтраў над вадой.

Радыёхвалі ў целе чалавека.

Праф. ленінградзкай лябараторыі Скрыцкі дасьледаваў, што арганізм чалавека можа ня толькі ўбіраць у сябе электрычную энэргію, але і пасылаць яе назад у выглядзе хвалі. Даўжыня такіх радыёхваль можа мяняцца ў залежнасьці ад таго, у якім варунках знаходзіцца чалавечы арганізм. Зараз лябараторыя распачала складаньне так званых «электрычных формул чалавека». Іначш кажучы, высьняецца, ад якіх асаблівасьцяў чалавечага арганізму залежыць даўжыня пасылаемай целам радыёхвалі і ад якіх прычын яна можа мяняцца. Калі гэта ўдасца дакладна дасьледваць, дык па зьменах радыёхваляў магчыма будзе судзіць аб розных зьменах у арганізьме чалавека, напр., хвароба, душэўны непакой і г. д.

Новая экспэдыцыя на Паўночнае канцавосьсе

Пасьля таго, як нарвэскі дасьледчык Амундсэн адкрыў Паўночнае канцавосьсе, Францыя распачала падрыхтоўку да пасылкі на Поўнач новай экспэдыцыі. Экспэдыцыя паедзе на шасьці спэцыяльна пастроеных аўтамабілях-санях. Аўтамабілі зроблены так, што яны павінны вытрымаць барацьбу з марозам і лёдам.

Бэнзынавы рухавік і ўсе яго прылады зьмешчаны ў шчыльна зачыненую скрынку, якая ахоўвае ваду ад замярзаньня. Дзеля язды па лёду аўтамабіль мае мэталічныя зубчатыя калёсы. У аўтамабіль уваходзяць праз страху па жалезнай адкіднай драбіне. За аўтамабілем будуць цягнуцца сані з запасам харчу і з матар'яламі для машыны. У кожным аўтамабілі паедзе 3-4 чалавекі, прычым кожны ўдзельнік экспэдыцыі павінен умець кіраваць аўтамабілем. На чале экспэдыцыі будзе стаяць лейтэнант Д рсі, пад кіраўніцтвам якога і ладзіцца экспэдыцыя.

Новы цепламер.

Ртутны цепламер ня можа служыць дзеля вымерваньня надта высокай тэмпэратуры, бо ртуць пры 360 градусах ужо пераходзіць у пар. Заводзкая практыка патрабуе такіх цепламераў, якімі можна было-б мерыць тэмпэратуру ў паўтары тысячы градусаў і вышэй. Нядаўна надуман новы цепламер, у якім замест ртуці ўжываецца рэдкі мэтал гальлі, каторы плавіцца пры 30 градусах, а кіпіць толькі пры 1 700 градусах—вышэй тэмпэратуры плаўленьня большасьці мэталаў. Гальлі надта дарагі мэтал і здабываецца з цынкавай руды ў нязначнай колькасьці.

Энэргія чалавечага сэрца.

Ангельскі фізыолёг прафэсар Хіля займаецца вывучэньнем працы чалавечага сэрца. Шэрагам сваіх апошніх дасьледаў ён устанавіў, што максымальная мускульная сіла сэрца раўняецца адной шасьцідзесятай конскай сілы.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА.

Панядзелак, 31 студзеня.

БЕЛАРУСКІ ПЕРШЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР.

Працаўнікі тэатру—палітычным вязьням Заходняй Беларусі і іх сем'ям.

Кастусь Каліноўскі.

Гістарычная драма ў 8 абразох.

Пачатак а 8 гадз веч.

ДЫРЭКЦЫЯ БЕЛАРУСКАГА НАВУКОВА ДАСЬЛЕДЧАГА ІНСТЫТУТУ СЕЛЬСКАЕ І ЛЯСНОЕ ГАСПАДАРКІ імя У. І. ЛЕНІНА

абвяшчае аб наступных

ВОЛЬНЫХ ПАСАДАХ АСЫСТЭНТАЎ

(па 120 р у месяц) і аспірантаў (па 70 р. у месяц) пры адчыненых аддзелах Інстытуту:

АСЫСТЭНТАЎ:

По адд. лясному . . . . . . 2 штат. адз.

» » меліярацыі і культуры балот . . . . 1 » »

АСЬПІРАНТАЎ:

По адд. лясному . . . . . . 4 штат. адз.

» » меліярацыі і культуры балот . . . . 3 » »

» » с-г. эканомікі . . . . . . 5 » »

Асобы, якія жадаюць заняць вызначаныя пасады, могуць падаваць заявы ў Дырэкцыю Н д. Інстытуту (Менск, Рэвалюцыйная, 21) ў працягу 2-х тыдняў.

Дырэкцыя Н. Д Інстытуту.

Дзяржаўным Выдавецтвам прыступлена да друку падручніка па палітграмаце

НІКУЛІХІНА і ПАДГОРНАГА

для школ перасовак і стацыянара" (ч. II).

Кніжка выйдзе з друку да 15 лютага г. г.

3—3. Заказы прымаюцца праз аддзяленьні ДВБ.

Даводзіцца да ведама падпісчыкаў на часопіс

„ПОЛЫМЯ",

што, акрамя ўжо апублікаваных у друку ільгот,

(Гл. «Савецкая Беларусь» № 11 за 1927 г.)

рэдакцыя „Полымя" прадастаўляе

гадавым падпісчыкам рассрочку,

якую можна ўносіць у 3 разы:

4 руб. 1 студзеня; 3 р. 50 к. 1 ліпеня і 2 р. 50 к. 1 кастрычніка 1927 году.

РЭДАКЦЫЯ „ПОЛЫМЯ".

ТЭАТР-КІНО

Беларускі Дзяржаўны Тэатр	Вялікая сцэна. Нядзеля, 30-га студзеня. **ЗМРОК** ПРЭМ'ЕРА. Драма ў 7 абраз. В. Шашалевіча. Пачатак а 8 гадз увеч
Кіно „Культура"	3 аўторка, 25 студзеня „УКРАЗІЯ". Пачатак сэансаў 1—5 г., 2—7 г. 45 хв. і 3—10 г. 30 хв.
Кіно „Чырвоная Зорка".	3 аўторка, 25-га студзеня „КОГДА ПРОСЫПАЮТСЯ МЕРТВЫЕ" з удзелам Ігара ІЛЬЛІНСКАГА.
Кіно Пролетары"	3 аўторка, 25 га студзеня „МАТЬ".

Ад дырэкцыі Беларускага Другога Дзяржаўнага Тэатру.

Даводзіцца да агульнага ведама, што на нядзелю, шостага лютага 1927 году, а 12 гадзіне ўдзень, у памяшканьні тэатру (Віцебск, Смаленскі плац № 4),

ПРЫЗНАЧАНА прыймо кандыдатаў у склад супрацоўнікаў **Б. Д. Т. 2.**

Ад кандыдатаў будуць вымагаць, каб былі знаёмы з беларускай мовай і мелі сцэнічныя дадзеныя: голас, дыкцыю (правільная і ясная вымова), слух, музычнасьць, рытмічнасьць. Іспыты будуць рабіць паводле наступнае схэмы:

1) **Умець чытаць напамяць:** а) адну байку; б) кавалак з якой небудзь п'есы (паводле абраньня кандыдата) в) два вершы.

2) **Сцэнічныя практыкаваньні:** імправізацыя, альбо эцюд (маленькія сцэнкі) на дадзеную тэму.

3) **Рытм і слух:** рабіць рухі паводле дадзенае музычнае тэмы, умець адзначыць рытм і лік.

4) **Голас — пяяньне:** падрыхтаваць адну—дзьве песьні ці рамансы, пажадана пад акампанімэнт; мець з сабой адпаведныя ноты.

Патрэбныя тлумачэньні і паясьненьні дае канцэлярыя БДТ2.

2—2

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ.

У магазынах ДВБ атрымана з Прагі Чэскай і прадаецца

часопіс паступовага студэнцтва

№ 1 „Новы Прамень"—72 стар.

ЦАНА 25 кап.

Не адцягвай падпіскі на газэту „САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ"

да апошняга тэрміну: ЛЮТЫ м-ц ужо пачынаецца

Жлобінскі ЗАГС выклікае на 25-га лютага гр-н Пашкоўскую Мар'ю Янкаву і Васільчэнку Сьцяпана па справе скасаваньня іх шлюбу.

Няяўка аднаго з бакоў разгляду справы ня спыніць.

ЗГУБЛЕНЫ,

— Шлюбнае пасьведчаньне № 790, выд. Менскім рабілам, Плыўнікa А. В.
— Лічная кніжка № 37, выд. Лошніцкім ВВК, Аскерко Б. А.
— Лічная кніжка № 63-24, выд. Глівенскім ВВК, Цітавец В. П.
— Чырвонаарм. кніжка, выд. 4-м чырвоназнамен. палком, Клімкевіч Г. А.
— Вучотная карта, выд. Халопеніцк. ВВК, Угнавенак Я. Р.
— Чырвонаарм. кніж., выд. 4-м чырвоназнам. палком Цітавец К. С.
— Беспрац. кніжка № 212, выд. Барыс. страхкас, Комар Д. П.
— Лекавая кніжка, выд. Барыс. страхкас., Бадроў М. Я.
— Чырвонаарм. кніжка, выд. 4-м чырвоназнамен. палком, Херевец М. І.
— Лекавая кніжка № 3075, выд. Барыс. страхкас., Паніна А. А.
— Лічная кніжка № 304-16, выд. Чэрвенск. ваенкамат., Дзяцяр Д. Г.
— Лічная кніжка № 479, выд. Барысаўск. РВК, Багдановіч М. П.
— Лічная карт. № 272-22, выд. Бытчанскім ВВК, 2) конская кніжка № 261, выд. Бытчанскім ВВК, Адамейко Н. С.
— Дакумант аб вызваленьні з спраўдому, выд, Барысаўск. спраўдомам Кульгавы Ф. Л.
— Лічная карт № 130, выд. Кузьмінскім выканкомам, Тамбоўск губ., Бычкоў К. П.
— Конская карт. № 792, выд. Бытчанскім ВВК, Луцкевіч Н. І.
— Пасьведчаньне на права ўласнасьці № 1641, выд. Барысаўск. акркамгаспадарк., Багдаловскі і Беркоўкі.
— Вэксаль на суму 135 руб., Багдановскі В. А.
— Чыгун. накладн. плацёж № 45759, выд. станц. Барысаў на суму 19 руб. Бэйненсон.
— Пасьведчаньне № 13, выд. узамен прыпісн. пасьведч. Багдановскім акрваенкамат., Елянсвіч Д. Е.
— Мэтрычн. даведка, выд. Барысаўск. Загсам. Гібалевіч А. М.
— Кааперац. кніжка, выд. МЦРК. Капрана Б. В. кв. 3375.
— Квіт аб узносе аванса за краму, выд. Барысаўск. акркамгаспад. Беркоўскі І. Х.
— Лічная карт. за № 10, выд. Барысаўск. ваенкамат· Савіч І. В
— Дапрызыўн. кніжка за № 173, выд. Зембінскім РВК. Мікуловіч А. П.
— Доўга-тэрміновая водпусная кніжка, выд. адд. ротай сувязі 5-й дывізіі. Зяленко І. Ф.
— Вучотная карт. за № 170, выд. Барыс. РВК, Ермачэнак В. А.
— Вучотная карт. за № 196, выд. Барыс. РВК, Павловец П. І.
— Вучотная карт. за № 28?, выд. Барыс. РВК, Кунацэвіч А. Г.
— Вучотная карт. за № 436, выд. Барыс. РВК, Шышпарэнак А. І.
— Вучотная карт. за № 445, выд. Барыс. РВК, Дземеш М. Д.
— Вучотная карт. за № 385, выд. Барыс. РВК, Цахавой А. І.
— Вучотная карт. за № 481, выд. Барыс. РВК, Прахарэвіч І. С.
— Вучотная карт. за № 147, выд. Барыс. РГК, Ухлейка В. М.
— Лекавая кніжка, выд. Барыс. страхкас., Ашароў М. Г.
— Лічная карт. за № 262, выд. Барысаўск. РВК. Курто П. В.
— Вучотная карт. за № 164, выд Барысаўскім ваенкаматам. Баркоўскі І. Д.
— Кааперацыйная кніжка, выд. чыгуначнай кааперацыяй у Нова-Барысаве. Савіцкі М. П.
— Лічная кніжка, выд. Менакрваенкамат. Чыжмароў Е. А.
— Пасьведчаньне адр „В" за № 29-322929, выд. канторай 7-га вучаст службы пуці. Царыф В. Е.
— Лічная карт. за № 404, выд. Барысаўск. РВК. Мытнік А. Я.
— Сяброўская кніжка за № 416, выд. Барысаўскім саюзам мэдсантруд Эльніна Х. М.
— Сяброўская кніжка, выд. Камянецкім саюзам савгандальслужачых Фодер Я. Н.
— Праязны білет па чыгунцы са зьніжэньнем 75 процантаў, выд. Барысаўск. Акрзо. Васько Н. Г.
— Лічная кніжка № 1888, выд. Халопеніцкім ВВК. 2) конская кніжка, выд. Халопеніцкім ВВК, Кудрашоў Д. Г.
— Сяброўскі білет № 551, выд. Нова-Барысаўск. саюзам хімікаў, Гнэсін С. Б.
— Лічная кніжка № 261, выд. Менскім ваенкамат., Ліўшыц А. Я.
— Асабовае пасьведч. № 255-14, выд. Зачысцкім ВВК, Лазерко І. С.
— Кааперац. кніжка, выд. Барыс. ЦРК, Дакшыцкі Я. Н.
— Конская кніжка, выд. Гл[illegible] 2) [illegible] кар[illegible]
— Чырвонаарм. кніжка, выд. 4-й батар. 2-га артпалка, 2) сяброўская кніжка, выд. Маскоўскім саюзам дрэваапрацоўч., Тарасенко Н. А.
— Чырвонаарм. кніжка, выд. 4-м чырвоназнамен палком, 2) льготн. пасьведчаньне № 1272, выд. 4-м чырвоназнамён. палком, 3) сяброўская кніжка № 63580, выд. Барысаўскім саюзам Рабіс, Ціхановіч А. А.
— Лекавая кніжка, выд. выд. Барысаўск. страхкас. Ковая А. А.
— Вучотная картка за № 172, выд. Барысаўскім РВК. Чычэн Н. Г.
— Вучотная карт. за № 336, выд. Барысаўск. РВК. Клебанаў С. Ш.
Вучотная карт. за № 408, выд. Барысаўск. РВК. Вык П. С.
— Вучотная карт. за № 409, выд. Барысаўск. РВК. Шлома А. Я.
— Вучотная карт. за № 388, выд. Барысаўск. РВК. Васілеўскі А. П.
— Вучотная карт. за № 263, выд. Барысаўск. РВК. Паловіка П. П.
— Вучотная карт. за № 217, выд. Барысаўск. РВК. Шыкевіч І. С.
— Вучотная карт за № 552, выд. Барысаўск. РВК. Вайцэховіч І. М.
— Лекавая кніжка, выд. Барысаўскай страхкас. Лісоўскі Н. Ф.
— Вучотна-вайсковая карт. дапрызыўніка, выд. Екацерынаслаўскім ваенкаматам. Іофе Я. Г.
— Вучтная карт. за № 120, выд. Барысаўск. РВК. Яблонскі В. І.
— Вучотная карт. за № 122, выд. Барысаўск. РВК. Загорскі І. А.
— Вучотная карт. за № 463, выд. Барысаўск. РВК. Ільюшэнак Н. Д.
— Сяброўскі білет за № 13441, выд. Барысаўскім саюзам прац. зямлі і лесу. Уласоў Ф. С.
— Вучотная карт. за № 548, выд. Барысаўск. РВК. Васілеўскі С. І.
— Вучотная карт. за № 164, выд. Барысаўск. РВК. Сацукевіч П. П.
— Вучотная карт. за № 166, выд. Барысаўск. РВК. Валкавец Н. Д.
— Лічная карта, выд. Забалоцкім ВВК, ад 26—VI-23 году. Раменчыка А. Ф., кв. № 3373.
— Сяброўскі білет за № 6-2634, выд. саюзам будаўнікоў. Біргера Л. Ф., кв. № 3374.
— Лічная кніжка за № 2, выд [illegible] нескім Ваенкаматам. Жыліна Б[illegible]
— Лічная кніжка за № 179 5[illegible] венскім ВВК. Ржэўскага І. Я[illegible]
— Дазвол. на права выр[illegible] штампу за № 102, выд. [illegible] канкому гор. Барысава, Ка[illegible] роты.
— Вучотная карт., выд, [illegible] Курган Г. Н.
— Белы білет, выд. [illegible] зыўнай камісіяй пры Ва[illegible] ская кніжка за № 798, в[illegible] Шчуцкі К. Б.
— Мэтрычн. выпіс, в[illegible] Аўтушка О. А.[illegible]
— Лекавая к[illegible] кас. Ганчарэ[illegible]
— Лічная [illegible]